№13-14 (242-243)
2008

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь




## Беларусь – паліцэйская дзяржава, абсалютна не падрыхтаваная да змаганьня з рэальным тэрарызмам...

Праваабаронцы і сваякі арыштаваных былых сяброў патрыятычнай арганізацыі “Белы легіён”, а таксама дэмакратычных лідэраў правялі 11 ліпеня ў Менску прэс-канферэнцыю з нагоды неабгрунтаваных абвінавачаньняў іх родных у выбуху, які адбыўся ў Менску 4 ліпеня на афіцыйным сьвяткаваньні гэтак званага "дня незалежнасьці".

Як паведаміла журналістам кіраўніца згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”, жонка Міраслава Лазоўскага Ніна Шыдлоўская: “Людзі, якія зьяўляюцца элітай нашай нацыі, бо многіх я ведаю асабіста, абвінавачваюцца ў злачынстве, скіраваным супраць мірных грамадзянаў. Такогаўвогуле ня можа быць…”

Далей яна падкрэсліла, што даўно не існуючы "Белы легіён" займаўся толькі спартыўна-патрыятычным выхаваньнем моладзі і не рыхтаваў апазіцыянераў для зьмены ўлады.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч асноўную ўвагу надаў юрыдычным аспектам затрыманьняў і прад’яўленых абвінавачаньняў актывістам, адзначыўшы, што ў пратаколах не прыводзіцца аніякіх, нават ускосных доказаў віны затрыманых.

Віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі падкрэсьліў, што ”сёньняшняя хваля рэпрэсіяў нагадвае тое, што было пасьля гучных віцебскіх выбухаў. Тады такім жа чынам быў беспадстаўна затрыманы актывіст Павел Красоўскі, але віны яго так і не знайшлі".




10 ліпеня, паведаміў спадар Бяляцкі, быў затрыманы актывіст БНФ, праваабаронца Ільля Богдан, якога распытвалі чамусьці не пра выбухі, а пра ягоную праваабарончую дзейнасьць, пра тое, што робяць праваабарончыя арганізацыі падчас выбарчай кампаніі.

Алесь Бяляцкі адзначыў рэальную наяўнасьць паліцэйскай дзяржавы, якая цудоўна ўмее праслухоўваць тэлефоны, можа змагацца са сваімі палітычнымі апанентамі, але абсалютна не падрыхтаваная да змаганьня з рэальным тэрарызмам...

Міліцыя выбрала "найбольш прымітыўную версію і распачала кампанію грамадзянскага тэрору на тле праходзячай выбарчай кампаніі", падагуліў праваабаронца.

Людміла Гразнова наўпрост праз прадстаўнікоў СМІ зьвярнулася да кіруючай наменклатуры, адвакатаў, суддзяў, супрацоўнікаў КДБ з заклікам памятаць не пра тэлефоннае права, а пра вяршэнс-

## Прызнаньне значнасьці

### Беларускі Хельсінскі камітэт стаў партнёрам Савету Еўропы

**У офіс БХК прыйшло паведамленьне аб тым, што Савет Еўропы надзяліў БХК статусам партнёра, тым самым прызнаючы працоўныя адносіны, якія склаліся паміж Саветам Еўропы і рэспубліканскай праваабарончай арганізацыяй.**

**Статус партнёра СЕ для нацыянальных грамадзкіх аб’яднаньняў быў заснаваны у 2003 годзе, каб адзначаць супрацоўніцтва, актыўную і канструктыўную ролю нацыянальных незалежных грамадзкіх аб’яднаньняў у рэалізацыі Праграмы дзеяньняў Савету Еўропы.**

**Арганізацыі, якія маюць статус партнёра Савету Еўропы, могуць наведваць сесіі Парламенцкай асамблеі і Кангрэсу рэгіянальных урадаў Савету Еўропы, іншыя мерапрыемствы і семінары СЕ, а таксама атрымліваць інфармацыю аб дзейнасьці гэтай уплывовай еўрапейскай арганізацыі.**

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*

# Падаткавікі ня могуць супакоіцца

Адразу пасьля завяршэньня прэс-канферэнцыі, прысьвечанай ціску ўладаў і арыштам грамадзка-палітычных актывістаў у выніку правядзеньня сьледства па крымінальнай справе аб выбуху ў Менску 4 ліпеня, у кватэру да юрыста і праваабаронцы Валянціна Стэфановіча пазваніў прадстаўнік Камітэту фінансавых расьсьледаваньняў па Менску і Менскай вобласьці Бобін Ю.К., каб уручыць яму позву. Паколькі самога Стэфановіча не было дома, жонка праваабаронцы дзьверы не адчыніла.

З тэлефоннай размовы з прадстаўніком камітэту Валянцін Стэфановіч высьветліў, што ад яго патрабуюць прадставіць дэкларацыю аб прыбытках за мінулы год, але такую дэкларацыю праваабаронца і ягоныя сваякі ўжо здалі ў раённую падатковую інсьпекцыю. Тым ня менш, у выніку гутаркі дамовіліся, што позву Валянцін Стэфановіч атрымае ў панядзелак і прадставіць Камітэту фінансавых расьсьледаваньняў копію запоўненай дэкларацыі.

Такім чынам, улады не спыняюць ціск на праваабаронцаў праз падатковыя інспекцыі. Нагадаем, што патрабаваньне прадставіць дэкларацыі аб прыбытках атрымалі практычна ўсе беларускія праваабаронцы і чальцы іхных сем'яў. Учора, 10 ліпеня, прайшла нарада па актуальных пытаньнях правядзеньня парламенцкіх выбараў з удзелам прэзідэнта, на якой Аляксандр Лукашэнка заявіў: "Любы апазіцыянер павінен адказаць народу на адно пытаньне: дзе ён працуе".



Валянцін Стэфановіч.

## КДБ цікавіцца сям'ёй праваабаронцы Валянціна Стэфановіча

**30 чэрвеня дамоў да жонкі вядомага праваабаронцы Валянціна Стэфановіча Аліны патэлефанавалі з упраўленьня КДБ па Менску і Менскай вобласьці з прапановаю тэрмінова з'явіцца на гутарку, не патлумачыўшы нават прычыны, па якой яе выклікаюць. Аліна адмовілася размаўляць бяз позвы і спыніла размову па тэлефоне.**

**Валянцін Стэфановіч расцэньвае дзеяньні сталічных "чэкістаў" як факт уціску непасрэдна на яго асабіста і на членаў ягонай сям'і і зьвязвае гэта непасрэдна са сваёй праваабарончай і грамадскай дзейнасьцю, а таксама з удзелам у маніторынгу выбараў у ніжнюю палату беларускага парламенту. Факты падобнага запалохваньня, на жаль, набываюць сёньня масавы характар.**

**Нагадаем, што крыху раней даходамі сям'і Стэфановіча цікавілася падатковая інспекцыя, а праваабаронцу выклікалі ў Дэпартамент фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржкантролю Беларусі.**

# У пастарунак – з палаты рэанімацыі

## Адкрыты ліст беларускіх праваабаронцаў

Вядомаму праваабаронцу, прадстаўніку РПГА "Беларускі Хельсінскі Камітэт" у Віцебску і рэгіёне, нашаму сябру, Паўлу Левінаву патрабуецца дапамога.

У сакавіку гэтага году Павел Ісакавіч аказваў прававую дапамогу журналістам, якія пацярпелі адператрусаў у сувязі са справай Мініча-Марозава-Абозава (справа аб палітычных мульціках, якія нібыта ганяць гонар беларускага прэзідэнта). У тыя дні Левінаў шмат каму пасьпеў дапамагчы, аднак быў затрыманы падчас аказаньня дапамогі журналісту Вадзіму Баршчэўскаму.

Праваабаронцу прад'явілі абвінавачаньне ў лаянцы і непадпарадкаваньні супрацоўнікам правапарадку. Паводле версіі прадстаўнікоў улады, Левінаў нецэнзурна выказваўся ў адносінах да маёра УУС Ігара Скарыновіча. Міліцыянты нават зьнялі інцыдэнт на відэа. Па словах Паўла Ісакавіча ў камеру ён сказаў толькі адно: "Здыміце, што я нічога такога не раблю". Відэазапіс у выніку так нікуды і не прыклалі. Спачатку супрацоўнікі правапарадку спасылаліся на тое, што відэа выйшла няякасным, "малюнак" занадта цёмны. Пасьля высьветлілася, што камера належыць аднаму з міліцыянтаў, і тое, як ён распарадзіцца матэрыяламі, зьяўляецца яго асабістай справай.

Пратэстуючы супраць фальсіфікацыі дакументаў (рапартаў і інш.), Павел Левінаў трымаў пятнаццацідзённую галадоўку, падчас і пасьля якой праваабаронца "прайшоў" не адну інстанцыю, дамагаючыся справядлівага расьсьледаваньня сваёй справы.

Пасьля быў шэраг ангажаваных судовых паседжаньняў, якія праходзілі з істотнымі парушэньнямі. Апафеозам стала рашэньне суда: 10 сутак і 700 тысячаў штрафу. Судзьдзя вынесла гэтае рашэньне ў адсутнасьць адказьніка (Левінаў загадзя апавясьціў яе, што на судзе ў той дзень быць ня зможа), што зьяўляецца супрацьзаконным.

Спрабуючы дамагчыся адмены незаконнага рашэньня суда, Левінаў 15 ліпеня пабываў на прыёме ў пракурора Віцебскай вобласьці Генадзя Дыско. Пракурор абяцаў разабрацца. Аднак на выхадзе з будынку абл-пракуратуры праваабаронцу сталі затрымоўваць супрацоўнікі міліцыі, дэманструючы пастанову суда аб 10 сутках арышту. Левінаў паспрабаваў зноў патрапіць да пракурора, у выніку затрымлівалі праваабаронцу яшчэ і сьпецназаўцы.

У РАУС Левінаву стала дрэнна, і "хуткая" адвезла яго у 2-ю Гарадзкую клінічную лякарню Віцебску. Дзяжурны кардыёлаг Валянціна Камоска, перамовіўшыся з кімсьці па тэлефоне, … адмовілася шпіталізаваць праваабаронцу. Выходзячы з лякарні, праваабаронца зьнепрытомнеў, у сябе ён прыйшоў толькі праз некалькі гадзінаў у палаце рэанімацыі.

І, на жаль, гэта ня першы выпадак, калі Паўлу адмаўляюць у медыцынскай дапамозе на працягу гэтай цяжбы. Першы раз "хуткую" выклікалі ў РАУС яшчэ ў той злапомны дзень, калі праваабаронца нібы брыдкасловіў. Тады медыкі не дазволілі адправіць Левінава на нары, аднак 16 ліпеня яго павезьлі ў аддзяленьне проста з палаты рэанімацыі. Начальнік медыцынскай часткі 2-й Гарадзкой клінічнай лякарні Віцебску Алена Мамчур адмовілася адказваць на пытаньне старшыні РПГА "Беларускі Хельсінскі Камітэт" Алега Гулака аб тым, ці можа Павел адбываць пакараньне пры тым стане здароўя, у якім знаходзіцца цяпер.

Мы просім Вас не застацца абыякавымі.

1.Зьвярніцеся да пракурора Віцебскай вобласьці Генадзя Дыско і яго памагатых з просьбай правесьці праверку законнасьці затрыманьня Паўла Левінава і забясьпечыць абарону яго правоў. Тэлефон Генадзя Дыско +37521 227 40 60

2.Зьвярніцеся да начальніка медыцынскай часткі 2-й Гарадской клінічнай лякарні Віцебску Алены Мамчур з пытаньнем, ці можа Павел Левінаў адбываць пакараньне ў тым стане здароўя, у якім знаходзіцца цяпер. Тэлефон Алены Мамчур +37521 234 09 32

*З павагай,*
**Старшыня РПГА**
**"Беларускі Хельсінскі Камітэт"**
**Алег ГУЛАК.**

# Звальненьні, запалохваньні, арышты –

## такі вынік першых тыдняў выбарчай кампаніі

7 ліпеня падчас прэс-канферэнцыі, якая адбылася ў сядзібе Партыі БНФ, лідэры Аб’яднаных дэмакратычных сілаў распавялі пра факты ўціску рэгіянальных уладаў на актывістаў, якія маюць намер узяць актыўны ўдзел у кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Не пасьпела пачацца выбарчая кампанія, як улады далі зразумець, што не пакінуць па-за ўвагаю тых людзей, якія пажадалі вылучацца кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад апазіцыі. Першымі актамі такога ўздзеяньня сталі непрацягі працоўных кантрактаў, звальненьні з працы тых, чые імёны апынуліся ў адзіным сьпісе прэтэндэнтаў у кандыдаты ад кааліцыі Аб’яднаных дэмакратычных сілаў. Алесь Мех з Кобрыну, сябра Партыі БНФ, інжынер Кобрынскага ўпраўленьня магістральных газаправодаў, які адпрацаваў там больш за чатырнаццаць гадоў, чалавек з дзьвюма вышэйшымі адукацыямі, пазбаўлены працы ад 1 ліпеня. Калі яго выклікалі да кіраўніцтва ўпраўленьня, то ў прысутнасьці начальніка мясцовага аддзяленьня КДБ паставілі ультыматум: альбо ты адмаўляесься балатавацца, альбо з табой не працягнуць кантракт, як тое, урэшце рэшт, і адбылося.

“Падчас гэтай размовы мяне таксама папярэдзілі, што, калі я буду балатавацца, то потым я нідзе не знайду працу – ні ў прыватным сектары, ні на дзяржпрадпрыемствах”, – паведаміў патэнцыйны кандыдат у дэпутаты парламенту.

Але ня толькі самога Алеся Меха тычыліся пагрозы. Яго запрасіў на размову памочнік дзейнага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Віктара Кучынскага Юры Філіновіч, які абяцаў дапамогу ў тым выпадку, калі спадар Мех адмовіцца ўдзельнічаць у выбарах. Аднак зьдзівіла Алеся Меха ня гэта. “Ён мне сказаў: калі ты ня здымеш сваю кандыдатуру, мы звольнім тваю жонку, – распавёў актывіст. – Ёсьць тэлефон, зараз мы патэлефануем кіраўніку аддзелу адукацыі, і ў тваёй жонкі таксама будуць праблемы”.

Аналагічны лёс напаткаў яшчэ аднаго актывіста БНФ Леаніда Аўтухова. Як адзначыў старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, ужо цяпер кіраўніцтва АДС змушана пераглядаць адзіны сьпіс сваіх кандыдатаў на выбары. “Сьвятлана Панамарова, якая знаходзіцца на дзяржаўнай службе, падвергласся ўціску, – распавёў палітык. – Яе паставілі перад фактам: альбо яна не балатуецца, альбо з ёй не падпісваюць кантракт. Канешне, у гэтай сітуацыі мы былі змушаныя зыходзіць, у першую чаргу, з інтарэсаў асобы, і яна выйшла з адзінага сьпісу”.

Анатоль Лябедзька прывёў яшчэ шэраг прыкладаў уціску на дэмакратычных актывістаў, якіх мясцовыя ўлады змушаюць адмовіцца ад удзелу ў выбарчай кампаніі. Так, пасьля вылучэньня назіральнікам у Цэнтрвыбаркам быў затрыманы і па надуманых прычынах асуджаны на сем сутак адміністрацыйнага арышту сябра палітрады АГП, намесьнік старшыні арганізацыі “Маладыя дэмакраты” Міхаіл Пашкевіч. Падатковая інсьпекцыя зьнянацку пачала моцны прэсінг актывіста партыі з чарнобыльскай зоны – з гораду Брагіну Леніда Судаленкі; аналагічны выпадак здарыўся з яшчэ адным актывістам Мікалаем Гаўрыленкам. А ў прадпрымальніка з Баранавічаў Мікалая Чарнавуса ўлады паабяцалі адабраць зямлю, выдзеленую пад будаўніцтва крамы.

А яшчэ, распавёў Анатоль Лябедзька, у дэмакратычных актывістаў міліцыянты пачынаюць высьвятляць, дзе тыя былі ў ноч з 3-га на 4-га ліпеня, падчас трагічных падзеяў у беларускай сталіцы. “Я ня ведаю, ці гэта ініцыятыва з Менску, ці гэта вар’яцтва на ўзроўні рэгіёнаў, – адзначыў кіраўнік АГП. – Ім кажуць, што калі вы будзеце займацца нейкай актыўнай палітычнай дзейнасьцю, уваходзіць у склад камісіяў ці ўдзельнічаць у выбарах, то мы вас можам зрабіць тэрарыстамі і зьвязаць са справай выбуху, які адбыўся ў Менску”.

Паводле словаў першага намесьніка старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, напярэдадні ўся гэтая інфармацыя была даведзеная да ведама дэлегацыі Еўрапейскай Камісіі на чале з кіраўніком палітычнага аддзелу Генеральнага сакратарыяту Еўрапейскага саюзу Хельгай Шмідт (дэлегацыя Еўракамісіі цяпер знаходзіцца ў Беларусі і абмяркоўвае пытаньні будучых выбараў як з апазіцыяй, гэтак і з афіцыйным Менскам).

“Мы назвалі ўчора гэтыя канкрэтныя факты і канстатавалі, што тое, што робіцца, на жаль, ужо сёньня вымушае нас гаварыць пра недэмакратычнасьць кантэксту, у якім адбываецца выбарчая кампанія”, – сказаў першы намесьнік старшыні Партыі БНФ.

“Мы падкрэсьлілі, што ўлады сёньня могуць даваць абяцанкі, што ў нас ёсьць пакет патрабаваньняў працэдурнага кшталту, які ўключае ў сябе рэгістрацыю кандыдатаў адзінага сьпісу, плюралістычнае фармаваньне выбарчых камісіяў усіх узроўняў, рэальную магчымасьць працаваць з людзьмі, – адзначыў Вінцук Вячорка. – Але да выбарчых патрабаваньняў, да патрабаваньняў, зьвязаных з ацэнкаю меркаваных выбараў, напрамую таксама адносіцца адсутнасьць страху ў грамадстве, адсутнасьць палітычнага, адміністрацыйнага і любога іншага перасьледу ўсіх уключаных у гэтую кампанію”.

Удзельнікі прэс-канферэнцыі адзначылі, што ніякія спробы ўладаў супрацьпаставіць суб’ектаў кааліцыі Аб’яднаных дэмакратычных сілаў адно аднаму ня будуць мець посьпеху. Лідэры АДС яшчэ раз зьвярнулі ўвагу ўладаў на небясьпеку выкарыстоўваць трагедыю, якая адбылася ў Менску ў ноч на 4-га ліпеня, у палітычных мэтах дзеля распальваньня варожасьці і перасьледу палітычных апанентаў дзейнае ўлады.

## У такіх умовах свабодная і справядлівая выбарчая кампанія немагчымая

**Заява Прэзідыуму Палітычнай Рады Аб’яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі**

**Замест таго каб шукаць сапраўдных злачынцаў, улада пачала выкарыстоўваць выбух у Менску 4 ліпеня для расправы з палітычнай апазіцыяй. Па стане на раніцу 11 ліпеня 2008 году арыштавана 16 чалавек, прычым большыню сярод іх складаюць актывісты і шараговыя сябры розных дэмакратычных палітычных партыяў і грамадзкіх ініцыятываў, сябры выбарчых штабоў кандыдатаў адзінага сьпісу АДС. Маладых актывістаў тэрарызуюць, затрымліваюць за пратэст супраць рэпрэсіяў. У краіне падчас выбарчай кампаніі запаноўвае атмасфера беспакаранага беззаконьня.**

**На жаль, непрадуманыя заявы некаторых еўрапейскіх палітыкаў пра "зьмякчэньне" палітычнага рэжыму ў Беларусі, спадзевы перавесьці дачыненьні з афіцыйным Менскам на камерцыйную аснову далі ўладзе магчымасьць спадзявацца на аўтаматычнае прызнаньне будучай выбарчай кампаніі як адпаведнай міжнародным стандартам.**

**Прэзідыум АДС заяўляе, што ва ўмовах масавых рэпрэсіяў пад выглядам расьсьледаваньня падзеяў 4 ліпеня ніякая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія немагчымая. Мы патрабуем неадкладнага вызваленьня невінаватых людзей і спыненьня рэпрэсіяў. Зьвяртаем увагу беларускага грамадства й міжнароднай супольнасьці на поўную неадпаведнасьць паміж заявамі А.Лукашэнкі пра жаданьне правесьці празрыстыя й справядлівыя выбары ды атмасферай цынізму і страху, створанай у краіне.**

**Зьвяртаемся да Генеральнага пракурора Беларусі з патрабаваньнем неадкладнай сустрэчы з кіраўніцтвам дэмакратычных палітычных партыяў з мэтай спыненьня палітычных рэпрэсіяў.**

**Заклікаем БДІПЧ АБСЕ разгледзець магчымасьць адмовы ад прысланьня міжнародных назіральнікаў у Беларусь, калі дэмакратычныя актывісты ня будуць вызваленыя і рэпрэсіі ня будуць спыненыя ў самы бліжэйшы час.**

**У выпадку працягу рэпрэсіяў АДС разглядае магчымасьць прыняць рашэньне пра зьмену фармату ўдзелу у выбарчай кампаніі.**

# Сфармавалі загадзя?

## Працэдура фармаваньня акруговых камісіяў засталася закрытай для грамадзянскай супольнасьці

### Вылучэньне і фармаваньне акруговых выбарчых камісіяў

Згодна з Каляндарным планам па правядзеньні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, які быў зацверджаны Пастановай Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па правядзеньні выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў, вылучэньне прадстаўнікоў у акруговыя выбарчыя камісіі павінна было пачацца 26 чэрвеня 2008 г. і скончыцца не пазьней за 11 ліпеня 2008 г. уключна.

Улічваючы выключную ролю акруговых выбарчых камісіяў пры арганізацыі і правядзеньні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, пытаньне фармаваньня акруговых камісіяў выклікала вялікую дыскусію.

Палітычныя партыі, якія ўваходзяць у кааліцыю Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС), склалі адзіны сьпіс кандыдатаў на вылучэньне ў склад акруговых выбарчых камісіяў, які быў зацьверджаны Палітрадай АДС 8 чэрвеня 2008 г. Сьпіс фармаваўся па наступных крытэрах: наяўнасьць досьведу працы ў дзяржаўных структурах, грамадзка-палітычны статус, месца працы, адукацыя. У дадзены сьпіс увайшлі 110 чалавек, сярод якіх такія вядомыя грамадзка-палітычныя дзеячы, як Станіслаў Шушкевіч, Мечыслаў Грыб, Аляксандр Сасноў, Павел Казлоўскі, Леў Марголін і інш.

Пры гэтым Палітрада АДС заявіла, што пытаньне ўключэньня ці неўключэньня кандыдатураў з адзінага сьпісу дэмакратычнай кааліцыі стане адной з умоў прызнаньня ці непрызнаньня парламенцкіх выбараў міжнароднай супольнасьцю. Лідэр АГП Анатоль Лябедзька выказаў меркаваньне аб тым, што ў выпадку неўключэньня ў склад акруговых выбарчых камісіяў членаў партыяў, якія ўваходзяць у АДС, будзе разгледжаны варыянт зьняцьця кандыдатаў і правядзеньне кампаніі байкоту выбараў.

У сваю чаргу старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па правядзеньні выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына заявіла, што пажаданьні Аб'яднаных дэмакратычных сілаў аб уключэньні іх прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісіяў, магчыма, будуць улічвацца. Па яе словах, "Лукашэнка станоўча выказаўся адносна таго, каб члены палітычных партыяў былі ўключаны ў склад акруговых выбарчых камісіяў. Зразумела, з улікам таго, ці ёсьць у дадзеных асобаў досьвед працы і іншыя перавагі, у тым ліку палітычная сьпеласьць."

Аб вылучэньні сваіх прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісіяў заявіла і кіраўніцтва нядаўна створанага грамадзкага аб'яднаньня "Белая Русь". Паводле інфармацыі намесьніка старшыні аб'яднаньня Аляксандра Шадзько ў акруговыя камісіі было вылучана 110 чалавек.

14 ліпеня 2008 г. адбыліся сумесныя пасяджэньні Прэзыдыўмаў абласных выканаўчых камітэтаў і абласных Саветаў дэпутатаў, Менскага гарадзкога выканаўчага камітэту і Менскага Савету дэпутатаў.

На гэтых пасяджэньнях разглядалася пытаньне аб фармаваньні акруговых выбарчых камісіяў. Рашэньнямі дадзеных органаў мясцовага кіраваньня былі створаныя 110 акруговых выбачых камісіяў. Усяго суб'ектамі, якім паводле выбарчага заканадаўства нададзена права вылучаць прадстаўнікоў у акруговыя камісіі (грамадзяне, працоўныя калектывы, грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі), было вылучана 1853 прэтэндэнты. Варта нагадаць, што максімальная колькасьць сяброў акруговых камісіяў складае 1432 чалавекі.

Па словах сакратара Цэнтральнай камісіі Мікалая Лазавіка, у склад акруговых камісіяў вылучана 1853 прадстаўнікі. "Сярод вылучэнцаў лідзіруюць прадстаўнікі грамадзянаў – 39,8 %, на другім месцы – прадстаўнікі грамадзкіх аб'яднаньняў (25,5%), на трэцім месцы – палітычных партыяў (20%) і працоўных калектываў (14,7%)" – паведаміў М.Лазавік.

Ён адзначыў, што "палітычныя партыі, якія пазіцыянíруюць сябе як апазіцыйныя", вылучылі ў склад акруговых камісіяў 118 чалавек (31,9% усіх прадстаўнікоў, вылучаных палітычнымі партыямі). "Яшчэ 18 чалавек вылучылі ад грамадзкага аб'яднаньня БНФ "Адраджэньне". Гэта 3,8 % прадстаўнікоў, вылучаных грамадзкімі аб'яднаньнямі", – сказаў М. Лазавік.

Такім чынам, разам Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы вылучылі 136 чалавек.

Па ягоных словах, найбольшая колькасьць прадстаўнікоў ад палітычных партыяў вылучана Кампартыяй Беларусі – 91 чалавек (24,5 % усіх партыйных вылучэнцаў) і Беларускай аграрнай партыяй – 62 (16,7). Ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі было вылучана 50 чалавек (13,5%), ад Партыі БНФ – 34 (9,2%).

Сярод грамадзкіх аб'яднаньняў 109 чалавек (23,2% вылучэнцаў ад грамадзкіх аб'яднаньняў) вылучана БРСМ, грамадзкае аб'яднаньне "Белая Русь" прапанавала 94 прадстаўнікі (19,4%), Беларускае грамадзкае аб'яднаньне ветэранаў вылучыла 71 прадстаўніка (15,2%).

Трэба адзначыць, што, як і ў папярэднія выбарчыя кампаніі, на сумесныя паседжаньні Прэзыдыўмаў абласных выканаўчых камітэтаў і абласных Саветаў дэпутатаў не запрашаліся прэтэндэнты, вылучаныя ў склад камісіяў, ім не паведамлялася аб выніках разгляду іх заяваў аб вылучэньні. На паседжаньнях адбывалася толькі фармальнае зацьвярджэньне складаў акруговых камісіяў, без абмеркаваньня кандыдатураў, якія былі вылучаныя ў іх склад. Гэтая акалічнасьць сьведчыць аб тым, што сьпісы акруговых камісіяў былі сфармаваныя загадзя. Незразумелым, як і падчас папярэдніх выбарчых кампаніяў, застаўся крытэр, якім кіраваліся аблвыканкамы і аблсаветы пры фармаваньні акруговых камісіяў.

У шэрагу абласьцей было адмоўлена ў прысутнасьці прадстаўнікоў грамадзкасьці і СМІ на паседжаньнях абласных выканкамаў і абласных Саветаў. Так, нематывавана было адмоўлена ў прысутнасьці на сумесным паседжаньні Менскага абласнога выканкаму і абласнога Савету прадстаўніку РГА "Беларускі Хельсінскі камітэт" Леаніду Мархотку. Таксама ня быў дапушчаны на паседжаньне Менгарвыканкаму і Менскага гарадзкога Савету дэпутатаў прадстаўнік БХК Уладзімір Осіпчык. Аналагічная сітуацыя склалася і ў Віцебскай вобласьці, дзе прадстаўнікоў БХК Васіля Берасьнева і Вадзіма Баршчэўскага не дапусьцілі на сумеснае паседжаньне абласнога і выканаўчага каміэту Віцебскай вобласьці, права прысутнічаць на гэтым паседжаньні таксама быў пазбаўлены і прадстаўнік незалежнага СМІ Петрушэнка.

Акрамя таго, было адмоўлена ў прадстаўленьні інфармацыі аб фармаваньні акруговых камісіяў прадстаўнікам палітычных партыяў АГП, БНФ, ПКБ, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад акруговых камісіяў г. Менску і Менскай вобласьці.

Таксама было адмоўлена ў прадастаўленьні інфармацыі аб выніках фармаваньня акруговых камісіяў прадстаўнікам БХК, і іншым суб'ектам у Гарадзенскай вобласьці.

Цікавая акалічнасьць назіралася на Гарадзеншчыне пры рэгістрацыі кандыдатаў у акруговыя камісіі, вылучаных дэмакратычнымі партыямі. Незалежна ад дня падаваньня пратаколаў аб вылучэньні, практычна ўсе кандыдаты ў камісіі ад Аб'яднаных Дэмакратычных Сілаў рэгістраваліся пад адным і тым жа нумарам – 17. Гэты факт наводзіў на падазрэньне, што сьпісы сяброў акруговых камісіяў мясцовая ўлада зацьвердзіла загадзя і фактычна склады камісіяў ужо былі сфармаваныя. Паседжаньне ў аблвыканкаме па выніках фармаваньня акруговых камісіяў па папярэдняй інфармацыі павінна было адбыцца а 10-й гадзіне. У Гарадзенскім аблвыканкаме катэгарычна адмовіліся паведаміць пра ўключэньне ці неўключэньне вылучэнцаў у акруговыя камісіі ад Аб'яднаных Дэмакратычных Сілаў (палітычных партыяў, якія ўваходзяць у АДС). На шматлікія тэлефанаваньні саміх вылучаных асобаў, старшыняў абласных структураў палітычных партыяў, праваабаронцаў і журналістаў з боку адказнага за фармаваньне акруговых камісіяў

прадстаўніка аблвыканкаму Леаніда Ермантовіча была адмова ў афіцыйнай інфармацыі, чыноўнік раіў толькі адно – чытаць мясцовую прэсу, дзе будзе надрукаваны склад камісіяў.

Ніводнаму з удзельнікаў маніторынгу па Магілёўскай вобласьці не ўдалося патрапіць на паседжаньні працоўных калектываў па вылучэньні ў члены акруговных камісіяў ці даведацца ад службовых асоб абласных выканаўчых камітэтаў, Саветаў дэпутатаў аб месцы і часе правядзеньня такіх сходаў. Ніводны з тых, хто па пасадзе павінен ведаць аб правядзеньні такіх сходаў, не здолеў назваць ніводнага месца іх правядзеньня.

Адмова ў доступе грамадзянам, дэлегаваным грамадзкімі арганізацыямі, на паседжаньні абласных выканкамаў і абласных Саветаў і адмова ў прадстаўленьні ім інфармацыі аб складзе створаных камісіяў, безумоўна, зьяўляецца парушэньнем прынцыпу галоснасьці пры правядзеньні выбараў. Так, у адпаведнасьці з арт. 13 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь падрыхтоўка і правядзеньне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ажыцьцяўляецца адкрыта і галосна.

Працягваецца адзначаная назіральнікамі на мінулых выбарах тэндэнцыя вылучаць шляхам збору подпісаў кіраўнікоў дзяржаўных арганізацыяў і ўстановаў, прадстаўнікоў структураў мясцовай выканаўчай улады: у камісію Баранавіцкай-Заходняй акругі № 5 – Пузікаў С. В. (сьпецыяліст аддзелу ідэалагічнай работы); у камісію Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 – Сьвінко В. Г. (намесьнік камандзіра вайсковай часткі) ды інш. З-за таго, што ў органах, якія ўтвараюць камісіі, адмаўляліся паказваць заявы з подпісамі грамадзянаў за кандыдатаў у камісіі, можна зрабіць высновы аб выкарыстаньні пры вылучэньні шляхам збору подпісаў адміністрацыйнага рэсурсу. Таксама гэта ўскосна пацьвярджаецца значным прадстаўніцтвам у акруговых сельскіх камісіях членаў, вылучаных шляхам збору подпісаў: камісія Баранавіцкай сельскай акругі № 7 – 7 чалавек (54%). Сярод вылучаных у яе шляхам збору подпісаў: Кунцэвіч А. К. (начальнік арганізацыйна-кадравага аддзелу Ляхавіцкага райвыканкаму); Каўбаса Л. В. (начальнік аддзела ідэалагічнай працы Ляхавіцкага райвыканкаму); Бурак М. І. (начальнік фонду сацыяльнага забесьпячэньня Ляхавіцкага раёну). У акруговую Івацэвіцкую камісію №11 шляхам збору подпісаў вылучаны 4 чалавекі (31%). Сярод іх – Пішч М. В. (начальнік Ганцавіцкага раённага вузла сувязі, кіраўнік раённага ГА “Белая Русь”), Сызранцаў А. К. (начальнік інсьпекцыі па ахове прыроды Ганцавіцкага раёну, кіраўнік прапрэзідэнцкай арганізацыі “Цытадэль”), Куіс Т. П. (дырэктар нарыхтоўчай канторы).

Удзельнікі маніторынгу зьвяртаюць увагу, што прадстаўнікі праўрадавых структур вылучаліся ў склад камісіяў, выкарыстоўваючы розныя шляхі, прадугледжаныя выбарчым заканадаўствам.

У некаторых рэгіёнах удзельнікі маніторынгу адзначаюць стварэньне структураў па правядзеньні выбараў, якія не прадугледжаныя выбарчым заканадаўствам. Так, у Жодзінскай выбарчай акрузе №66 на першым паседжаньні старшынёй камісіі быў абраны Пугач А.С. (зьяўляецца старшынёй Жодзінскага гарсавету дэпутатаў). У сваім выступе ён адзначыў: “Паралельна стварэньню АВК створаны і гарадскі штаб па правядзеньні выбараў, з якімі мы будзем працаваць сумесна, каб належна правесьці выбары”.

### Вынікі фармаваньня акруговых выбарчых камісіяў

Па нашай інфармацыі, у склад створаных акруговых выбарчых камісіяў увайшлі наступныя прадстаўнікі палітычных партыяў (*гл. табліцу*): мадзкіх аб’яднаньняў, якія ўвайшлі ў склад акруговых выбарчых камісіяў. Так, падчас папярэдніх выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 2004 г. у склад акруговых выбарчых камісіяў увайшлі 22 прадстаўнікі апазіцыйных партыяў і аб’яднаньняў, а ў гэтым годзе ў склад акруговых камісіяў патрапіла 38 прадстаўнікоў палітычных партыяў, якія ўваходзяць у АДС, што склала 32% ад вылучаных імі (118 чалавек) і 2,2% ад увайшоўшых у склад камісіяў.

Трэба адзначыць, што палітычныя партыі, якія ўваходзяць у АДС, прапанавалі ўключыць па адным прадстаўніку ў склад кожнай акруговай камісіі. Імі быў складзены сьпіс са 110 прэтэндэнтаў у камісіі. Гэтае патрабаваньне разглядалася як мінімальная ўмова апазіцыйных партыяў у галіне дэмакратызацыі выбарчага працэсу, аднак яно засталося не выкананым.

**Табліца складу прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партыяў у акруговых выбарчых камісіях пад час выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 2008 г.**

| Партыя | БНФ | АГП | ПКБ | БСДП (Г) | БСДГ |
|---|---|---|---|---|---|
| | Вылучана 51 | Вылучана 50 | Вылучана 18 | Вылучана 15 | Вылучана 2 |
| г. Мінск | 2 | 1 | 4 | 1 | 0 |
| Мінская вобл. | 2 | 3 | 2 | 2 | 0 |
| Віцебская | 1 | 1 | 2 | 2 | 0 |
| Гомельская | 0 | 3 | 0 | 0 | 0 |
| Гродзенская | 0 | 1 | 1 | 0 | 0 |
| Брэсцкая | 2 | 2 | 1 | 1 | 0 |
| Магілёўская | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 |

*Высновы:*

Фармаваньне акруговых выбарчых камісіяў адбывалася фармальна: кандыдатуры, вылучаныя ў камісіі, не абмяркоўваліся і не запрашаліся на пасяджэньні, ім не паведамлялася аб выніках разгляду іх кандыдатураў.

Як і ў папярэднія выбарчыя кампаніі, засталіся незразумелымі крытэры адбору прэтэндэнтаў у склад выбарчых камісіяў. Адсутнасьць такіх ясна сфармуляваных крытэраў дазваляе мясцовым органам улады (аблвыканкамам і аблсаветам) ствараць акруговыя камісіі, зыходзячы з прынцыпу падкантрольнасьці.

Трэба адзначыць, што грамадзяне, якім адмовілі ў уваходжаньні ў склад акруговых камісіяў, фактычна пазбаўленыя магчымасьці абскардзіць рашэньне органаў, якія стварылі камісіі, у тым ліку і ў судовым парадку. У адпаведнасьці з часткай 4-й арт.122 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь рашэньні мясцовых органаў улады могуць быць абскарджаны ў судовым парадку. Аднак на практыцы суды не прымаюць падобныя скаргі да сваёй вытворчасьці.

У большасьці выпадкаў (у чатырох з шасьці абласьцей) на сумесныя пасяджэньні аблвыканкамаў і аблсаветаў не былі дапушчаны прадстаўнікі грамадзкіх аб’яднаньняў, дэмакратычных партыяў і СМІ. Такім чынам, паўтарылася практыка папярэдніх выбарчых кампаніяў, калі такія важныя мерапрыемствы выбарчай кампаніі, як фармаваньне акруговых камісіяў, праходзяць непразрыста, без удзелу прадстаўнікоў грамадзкасьці.

Як станоўчы факт можна адзначыць павялічэньне колькасьці прадстаўнікоў апазіцыйных партыяў і гра-

Як і падчас папярэдніх выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, большасьць членаў акруговых выбарчых камісіяў прадстаўляюць сябры праўрадавых палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў (КПБ, РГА “Белая Русь”, БРСМ), прадстаўнікі органаў, якія стварылі камісіі, члены працоўных калектываў. Пры гэтым у большасьці выпадкаў старшынямі камісіяў, намесьнікамі старшыняў і сакратарамі акруговых выбарчых камісіяў абраныя прадстаўнікі мясцовых органаў улады, кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў.

Удзельнікамі маніторынгу адзначаюцца факты стварэньня “штабоў па правядзеньні выбараў” і “рабочых груп”, створаных пры органах мясцовых выканаўчых уладаў. Варта адзначыць, што выбарчым заканадаўствам не прадугледжана стварэньне такіх органаў, невядомыя таксама іх паўнамоцтвы і кампетэнцыя. Стварэньне дадзеных органаў выклікае заклапочанасьць тым, што яны могуць выкарыстоўвацца мясцовымі выканаўчымі органамі ўлады ў мэтах кантролю над выбарамі.

Такім чынам, працэдура фармаваньня выбарчых камісіяў засталася нязьменнай, органы ўлады не прадэманстравалі зьмены ў сваім падыходзе да фармаваньня камісіяў. Акруговыя выбарчыя камісіі не прадстаўляюць шырокія колы грамадзтва, усіх удзельнікаў выбарчага працэсу. Прадстаўленьне апазіцыйных партыяў у складзе камісіяў па-ранейшаму залежыць ад волі мясцовай улады, а сама працэдура фармаваньня зьяўляецца закрытай для грамадзянскай супольнасьці.

# Міліцыя пакуль "бездапаможная"

## Брудныя тэхналогіі ціску на дэмакратычнага прэтэндэнта ў кандыдаты ў Смаргоні

Ірына Вештард 21 ліпеня падала ў Смаргонскую акруговую камісію заяву аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. На наступны дзень – 22 ліпеня паміж 16.00 і 17.00 дзьверы ў яе кватэру аказаліся размаляванымі чорнаю фарбай. У гэтую ж ноч невядомымі быў папсаваны замок.

Калі 23 ліпеня апоўдні спадарыня Ірына выходзіла з кватэры, дык не змагла ўставіць ключ у вонкавую скважыну – верагодней за ўсё туды залілі клей. Міліцыянты, якія прыбылі на месца здарэньня, дапамаглі пераставіць замок. А ўначы з 23 на 24 ліпеня жанчыну разбудзіў моцны грукат. Адразу яна вырашыла, што гэта зваліўся вазон з кветкамі – такое ўжо здаралася. Але, зайшоўшы ў залу, яна пабачыла на падлозе камень і пабітае шкло, а адхінуўшы фіранкі – дзірку ў шыбе і трэшчыны, якія ад яе разыходзіліся. А палове на другую ночы камень разьбіў двайное шкло вакна і трапіў у пакой. Па ўсіх трох фактах Ірына Вештард выклікала міліцыю, але плёну тое не прынесла – хоць міліцыянты і зафіксавалі ўсе гэтыя выпадкі, склаўшы адпаведныя пратаколы, пры гэтым яны фатаграфавалі кватэру. Па словах спадарыні Ірыны, яна ня мае асабістых ворагаў, якія б ёй помсьцілі, і здарэньні яна лічыць палітычна матываваным тэрарызмам. На яе, жанчыну, вырашылі аказаць такі моцны ціск, але спн. Вештард заявіла, што ні ў якім разе не здыме сваёй кандыдатуры.

Новы віток ціску пачаўся 25 ліпеня адразу двума здарэньнямі. Увесь дзень мабільны тэлефон спадарыні Ірыны быў "атакаваны" тэлефанаваньнямі ад мужчынаў. Усе яны знайшлі яе нумар на інтэрнэт-старонцы ў разьдзеле "інтым".

30 ліпеня ў Смаргоні зьявіліся ілжывыя ўлёткі ад імя кіраўніка ініцыятыўнай групы прэтэндэнта ў кандыдаты Ірыны Вештард – праваабаронцы Аляксандра Дзергачова. Ва ўлётцы гаворыцца: "Моей коллеге по правозащитной деятельности Ирине Вешторд требуется материальная помощь. Ирина Вешторд из-за отсутствия достойных должностей не работает уже 12 лет. Ее деятельность в составе оппозиционной партии А. Козюлина не дает желательных доходов. А Ирине необходимо вести избирательную кампанию и стать депутатом, чтобы защищать ваши права. Обращаюсь ко всем гражданам, которым небезразлична судьба страны, сдать в поддержку Ирины Вешторд по 10 тыс. руб. Обращайтесь ко мне по телефону (номер)".

Гэтая ўлётка стала рэакцыяй на зварот А. Дзергачова да смаргонцаў пра маральную падтрымку Ірыны Вештард, на якую аказваецца небывалы ціск з моманту рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. У сваім звароце праваабаронца ўказаў: "Ціск аказваецца фактычна крымінальнымі метадамі… Каму выгодныя садысцкія метады барацьбы з Ірынай Вештард, якая бескампрамісна адстойвае інтарэсы людзей? Лічу, што дзеяньні злачынцаў зьяўляюцца палітычна матываванымі. Міліцыя пакуль бездапаможная, хаця па кожным такім факце праінфармаваная. Тых грамадзянаў, якія валодаюць інфармацыяй пра злачынцаў, прашу паведамляць мне па тэлефоне (нумар) ці па тэлефоне 102. Праваабаронца А. Дзергачоў".

Нагадаем, што з часу рэгістрацыі ініцыятыўнай групы на Ірыну Вештард абрынуўся цэлы шквал правакацыяў і злачынных дзеяньняў. Ёй пашкодзілі дзьверы – расфарбавалі чорнай фарбай і сапсавалі замок, уначы разбілі шыбу каменем, а нумар мабільнага тэлефону зьмясьцілі на інтэрнэт-старонцы ў разьдзеле "інтым". Затым па Смаргоні невядомымі былі распаўсюджаныя ўлёткі, у якіх ад імя праваабаронцы і грамадзкай актывісткі Ірыны Вештард заклікалася ахвяраваць на яе перадвыбарчую дзейнасьць па 5 тысячаў беларускіх рублёў.



УВАЖАЕМЫЕ ИЗБИРАТЕЛИ

По Сморгонскому избирательному округу намерена выдвигаться в депутаты член оппозиционной партии А.Козюлина **Вешторд Ирина Зеноновна.**

Просьба всех активных граждан оказать материальную помощь И.Вешторд в размере 5 тысяч рублей в проведении избирательной кампании.

За справками обращаться по адресу: г.Сморгонь, ул.Заводская, д.56, к.3, кв.11, тел. 3-62-56

# Пракуратура сьведкаў выклікаць "забыла"

Падчас збору подпісаў Аляксей Паўлоўскі з Магілёву сутыкнуўся з неардынарнай сітуацыяй, якая пазьней паўтарылася шмат разоў. Справа ў тым, што некаторыя жыхары дамоў адмовіліся даваць за яго свае подпісы, матывуючы гэта тым, што дырэктар сярэдняй школы №33 спадар Нікіфарэнка яшчэ да пачатку выбарчай кампаніі склікаў паседжаньні бацькоў, на якіх паведамляў ім і школьнікам, што спадар Аляксей Паўлоўскі дармаед, два гады нідзе не працаваў і жыў за кошт дзіцячых дапамог і што за яго ня варта ні падпісвацца, ні галасаваць.

З гэтай нагоды спадар Паўлоўскі падаваў скаргу ў Пракуратуру, якую падпісала 10 бацькоў школьнікаў, але суд і Пракуратура адмовіліся разглядаць гэтую справу з-за таго, што факты не пацьвердзіліся, бо супрацоўнікі Пракуратуры выклікалі на размову дырэктара школы, які сказаў, што нічога такога не рабіў, а тых, хто быў сьведкам ягоных выказваньняў, Пракуратура чамусьці выклікаць "забыла".

"Мне вельмі крыўдна, – гаворыць Аляксей, – бо факт майго беспрацоўя сапраўды меў месца. Але гэта было выклікана маім незаконным звальненьнем з працы. У гэты час я ні ў якім разе ня жыў за сацыяльную дапамогу дзяцей. Я выйграў 10 судоў па справе свайго незаконнага звальненьня, і будаўнічы трэст №12, месца маёй былой працы, на працягу двух гадоў выплочваў мне грашовую кампенсацыю. Акрамя гэтага, у мяне ёсьць кавалак зямлі, на якім я пастаянна працую".

Аляксей поўны аптымізму і бачыць у чорным піяры добры знак – улада глядзіць на яго з небясьпекай, як на патэнцыйнага дэпутата, а здавацца ён не зьбіраецца.

# Апазіцыйныя партыі лідзіруюць?

Паводле афіцыйных дадзеных, усяго на рэгістрацыю ініцыятыўных групаў пададзена 448 заяваў. З улікам таго, што ў Палаце прадстаўнікоў 110 месцаў, то сярэдні конкурс па краіне ужо складае каля 4 прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат.

**Рэйтынг лідэраў па заяўках**

Ужо сёньня можна канстатаваць, што найбольшы конкурс сярод кандыдатаў будзе ў сталіцы – у сярэднім 6,5 чалавек на адно месца. Самы высокі конкурс за межамі сталіцы ў Магілёўскай вобласьці – 4,3 чалавека на месца, самы маленькі ў Берасьцейскай і Гарадзенскай – 3 чалавекі.

У ліку партыяў, прадстаўнікі якіх падалі дакументы на рэгістрацыю ініцыятыўных групаў, лідзіруюць апазіцыйныя. Што тычыцца лаяльных уладзе, то безумоўным лідэрам у гэтай намінацыі зьяўляецца Камуністычная партыя Беларусі. У сьпісе заявак на рэгістрацыю ініцыятыўных групаў яе прадстаўнікоў больш за усіх астатніх лаяльных партыяў разам узятых, і роўна столькі ж, колькі ў іх галоўных апанентаў – апазіцыйнай Партыі камуністаў Беларускай (18 заявак).

На першым месцы па заяўках Аб'яднаная грамадзянская партыя (29), за якой ідзе Партыя БНФ (22). Што тычыцца астатніх, то прадстаўнікоў казулінскай Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) у тры разы больш, чым у шушкевічаўскай партыі "Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада" – 18 і 6 заявак адпаведна. Пакуль партыйных удзельнікаў кампаніі крыху менш за 1/4 ад агульнай колькасьці пададзеных заявак на рэгістрацыю ініцыятыўных групаў.

**Цікавыя супернікі**

Што тычыцца цікавых персаналіяў, якія ўдзельнічаюць у кампаніі, то сёлета іх надзвычай многа. Назавем толькі некаторых з іх. Актывіст руху "За свабоду" Віталь Каратыш зарэгістраваў ініцыятыўную групу ў Лунінецкай выбарчай акрузе №13. Ягоны брат Іван паведаміў "Нямецкай хвалі" пра пасьпяховы збор подпісаў. Цікавостка ў тым, што Віталь нядаўна тэрмінова быў прызваны на службу ў войска. Калі Віталя зарэгіструюць кандыдатам, то гэта будзе прэцэдэнт удзелу ў кампаніі салдата тэрміновай службы, але калі ён пераможа, то ў Авальнай зале ўпершыню зьявіцца дэпутат у мундзіры шараговага салдата.

Ня менш цікавы выпадак з былым кіраўніком "Белага легіёну" Сяргеем Чыславым. Нагадаем, ён разам з паплечнікамі быў затрыманы па падазрэньні ў датычнасьці да выбуху на канцэрце ў Дзень незалежнасьці, не атрымаў абвінавачаньня і быў вызвалены з-пад варты. Сп. Чыслаў знаходзіцца пад падпіскай аб нявыезьдзе і таму ня мае магчымасьці вярнуцца ў Маскву, дзе апошні час стала жыве.

Чалавек, з якога ўлады спрабавалі ляпіць вобраз тэрарыста, вылучаецца ў сталічным раёне Малінаўка па Ясенінскай выбарчай акрузе №100. У яго ініцыятыўную групу ўваходзіць філосаф і метадолаг Уладзімір Мацкевіч. Таму і дзейны дэпутат-камуніст Ігар Карпенка, і прадстаўніца Партыі БНФ Валянціна Сьвяцкая, якая ідзе па сьпісе АДС, атрымалі ў гэтай акрузе ўдвая цікавага суперніка.

# Старшыня ЦВК абвінавачвае апазіцыю ў парушэньнях закону

Вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пачалося 20 ліпеня. Ніводзін з прэтэндэнтаў ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў на мандаты дэпутатаў ня будзе абмяжоўвацца вылучэньнем на партыйных зьездах. Паралельна яны будуць зьбіраць подпісы грамадзянаў.

Збор подпісаў дае магчымасьць кантактаваць з выбарцамі. Акрамя таго, закон дазваляе на зьездзе вылучаць кандыдатаў толькі ў тыя акругі, дзе існуюць афіцыйна зарэгістраваныя партыйныя суполкі, — тлумачыць сябра Палітрады АДС, сакратар ЦК Партыі камуністаў беларускай Алена Скрыган:

"Таму ж улады і нішчылі нашыя структуры. Усе ў нас, хто ідзе праз партыю, будуць вылучацца і праз збор подпісаў. Гэта і для падстрахоўкі, і для таго, каб ужо з людзьмі працаваць. Можна ж паказваць і фатаграфію, і біяграфічныя дадзеныя, і расказваць людзям, чаму ён вылучаецца, і падтрымкі ў іх прасіць... Гэта ж усё дазваляецца падчас збору подпісаў".

Тым часам старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына абвінаваціла некаторых прадстаўнікоў апазіцыі ў тым, што яны друкуюць свае ўлёткі за межамі Беларусі:

"Падчас збору подпісаў забаронена раздаваць улёткі, нейкія плакаты, якія рэкламуюць патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты. Ініцыятыўная група можа толькі паказваць інфармацыйныя матэрыялы, якія характарызуюць кандыдата ў дэпутаты.


Лідзія Ярмошына.

А ёсьць улёткі спадароў Калякіна, Вячоркі. Іх раскідалі ў паштовыя скрыні яшчэ да пачатку вылучэньня прадстаўнікі так званых аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Гэтая ўлётка выдадзена ў Казані. Хачу зьвярнуць увагу, што, згодна з беларускім заканадаўствам, уся рэкламная прадукцыя павінна вырабляцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь".

Вінцук Вячорка так рэагуе на гэтае абвінавачаньне:

"Распаўсюджваць партыйныя матэрыялы фармальна не забаронена ў любы час. Заклікаў выбарчага характару ў іх няма. І наогул усе гэтыя абвінавачаньні выглядаюць сьмешнымі, калі нашых актывістаў кідаюць у турмы. Матэрыялы, пра якія ідзе размова, ня ёсьць выбарчыя. А дзе іх выдаваць, любая арганізацыя сама вырашае".

## Тацяна СЕВЯРЫНЕЦ:
# "Страх, як бізун, якім палохаюць"

Апазіцыйныя кандыдаты знаходзяцца пад пільнай увагай і моцным прэсінгам уладаў ад самага пачатку выбарчай кампаніі. Так, у Віцебску з вялікімі перашкодамі ўдалося зарэгістраваць ініцыятыўную групу Тацяне Севярынец:

– На людзей, натуральна, цісьнуць, бо ўлады ведаюць, што людзі знаходзяцца ў прамой залежнасьці ад іх – хто месцам працы, хто жыльлём. Страх, як бізун, якім палохаюць, – гаворыць Тацяна Яўгенаўна. – Адной з сяброў маёй ініцыятыўнай групы – Лідзіі Карповіч – пагражалі судом і высяленнем з інтэрнату, дзе яна жыве разам са сваімі непаўнагадовымі дзецьмі. Што за людзі да яе прыходзілі – невядома. Але ўрэшце рэшт яна была вымушаная напісаць заяву, у якой указала, што не зьяўляецца сябрам маёй ініцыятыўнай групы. І зараз запалоханая жанчына нават не выходзіць на сувязь, яна баіцца са мной сустракацца...

У Віцебскай Горкаўскай акрузе №17, дзе Таццяна Севярынец зьбіраецца вылучацца кандыдатам у дэпутаты, ёй таксама сітуацыю не праясьнілі. "Я прыйшла туды, каб даведацца, што за людзі прыходзілі да Лідзіі Карповіч, – працягвае Тацяна Яўгенаўна. – Аднак там сказалі, што ім нічога не вядома, і даказаць сам факт ціску на сябра маёй ініцыятыўнай групы будзе немагчыма".

Тацяна Севярынец была вымушаная падаць новы сьпіс сваёй ініцыятыўнай групы.

Артур ФІНЬКЕВІЧ:

# "Мы ўзялі на сябе адказнасьць за будучыню краіны"

***З-за актыўнай грамадзкай пазіцыі Артур Фінькевіч правёў больш за два гады ў зьняволеньні, стаўшы адным з рэпрэсаваных на сумленьні сёньняшняй улады.***



Артур Фінкевіч.

### Як прыйшоў у арганізацыю

Далучыўся Артур да Маладога Фронту яшчэ ў 2001 годзе, падчас кампаніі па выбарах прэзідэнта. Сустрэўшыся з маладафронтаўскім лідэрам Паўлам Севярынцам, вельмі ўразіўся яго прамовай і верай у будучыню Беларусі. Пасьля гэтага адразу далучыўся да дзейнасьці без якіх-небудзь сумневаў – знайшоў сябе ў працы арганізацыйнага аддзелу па вулічных акцыях і кампаніях. На пытаньне: "Як зразумеў, што МФ – гэта тваё?", Артур узгадвае 2001 год:

– Калі я прыйшоў, як і тысячы іншых людзей, на Кастрычніцкую плошчу пасьля выбараў і пабачыў паразу, то зразумеў: старая апазіцыя да перамогі ня здольная. Мяне ўключылі ў склад Управы, і я стаў займацца працай з рэгіёнамі, пасьля ўжо стаў каардынаваць аддзел па масавых акцыях і арганізацыйных кампаніях.

А з 2003 па 2006 год Артур працаваў на сталічным Чэрвеньскім кірмашы, гандлюючы кавай і гарбатай. Напрыканцы 2005 году пад ціскам КДБ ён разам з іншымі маладафронтаўцамі, якія зараблялі сабе на жыцьцё такім чынам, быў вымушаны прыпыніць працу. Але і цяпер яго радыя бачыць і сотні гандляроў, прадпрымальнікаў.

### Крымінальны перасьлед

Першы раз Артур Фінькевіч патрапіў на суткі ў 2003 годзе – як толькі споўнілася 18 гадоў. Тады яго затрымалі за ўдзел у акцыі 14 лютага "Дзень Сьвятога Валянціна" і кінулі ў вядомую Акрэсьцінскую турму. Але гэта не спалохала маладога актывіста. Артур прымаў удзел і часам сам арганізоўваў шматлікія кампаніі па тэрыторыі краіны: "Беларусь у Еўропу!", "Горад Наш", "Не! ілжывым рэферэндумам", за якія атрымліваў чарговыя суткі ад беларускіх уладаў.

А напярэдадні выбараў прэзідэнта ў 2006 годзе быў затрыманы падчас нанясеньня графіці "Мы хочам новага!" і пасаджаны ў СІЗА №1 па вуліцы Валадарскага. Супраць Фінькевіча ўзбудзілі крымінальную справу па факце нанясеньняў надпісаў на жылыя і адміністрацыйныя дамы, платы, прыпынкі. Яму пагражала ад 7 да 10 гадоў зьняволеньня. Але суд прыняў да ўвагі толькі тыя графіці, на месцах якіх Артур і быў затрыманы, таму прызначыў два гады папраўчых работ – так званай "хіміі".

З таго часу сачыць за жыцьцём Артура больш сур'ёзна ўзяліся структуры сьпецслужбаў, якія кантралявалі ўсё, што зьвязана з ім. Напрыканцы 2007 году ўзбуджаная новая крымінальная справа па факце парушэньня правілаў адбыцьця пакараньня. Суд, які адбыўся напрыканцы 2007 году, вынес Артуру Фінькевічу 1,5 гады зьняволеньня. Але ўжо ў лютым 2008 году палітвязень быў на свабодзе, што сталася вынікам доўгіх перамоваў беларускай улады з кіраўніцтвам ЗША. З гэтага часу Артур Фінькевіч яшчэ больш умацаваўся ў веры ў перамогу – духоўна і маральна. Яго імя некалькі разоў называў міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў, добра ведаюць Артура і іншыя прадстаўнікі дзяржаўных структураў. Ведаюць, бо вымушаны далей змагацца з ім і тымі, хто стаіць і стане ў бліжэйшай перспектыве разам у адзіны фронт.

За час турэмнага зьняволеньня Артура падтрымлівалі ня толькі сябры Маладога Фронту, але і актывісты з іншых дэмакратычна-арыентаваных арганізацыяў, партыяў, незалежных прафсаюзаў, пісьменьнікі, А. Мілінкевіч, праваабарончыя арганізацыі. Словы падтрымкі і асуджэньне беларускага рэжыму гучалі з высокіх трыбунаў ЕС і ЗША. Штомесяц праходзілі акцыі салідарнасьці як у Беларусі, так і з дапамогай беларускіх дыяспараў, далёка за межамі нашай краіны. З турэмнага жыцьця яму больш запамяталася тамтэйшая атмасфера:

(Працяг на стар. 15)

## Ператрус у штаб-кватэры Маладога Фронту

**Супрацоўнікі Камітэту дзяржаўнай бясьпекі і міліцыі увечары 21 ліпеня ўварваліся ў менскую штаб-кватэру незарэгістраванай арганізацыі Малады Фронт, як толькі скончылася паседжаньне ўправы гэтай арганізацыі. Пра гэта паведаміла намесьнік старшыні Маладога Фронту Наста Палажанка.**

**Некаторым актывістам удалося сысьці, а некалькі чалавек засталіся ў офісе. Супрацоўнікі КДБ пачалі ператрус. Яны вынесьлі з офісу больш за паўтара дзясятка пакункаў з літаратурай, улёткамі, носьбітамі інфармацыі, праверылі ўсе кампутары і забралі некаторыя сістэмныя блокі.**

**Па сканчэньні ператрусу супрацоўнікі КДБ запатрабавалі, каб Наста Палажанка і двое яе паплечнікаў паехалі з імі.**

**Наста паведаміла падрабязнасьці гэтага здарэньня:**

**– Дзесьці цягам гадзіны нам званілі ў дзьверы міліцыянты. Паколькі дзьверы дастаткова моцныя, яны не маглі іх адчыніць без дадатковых тэхнічных прыладаў. Таму яны проста званілі, затым было зацішша. Мы праверылі з дапамогай людзей, што былі на вуліцы, ці ёсьць яны там. Даведаліся, што іх няма, адчынілі дзьверы, некалькіх чалавек выпусьцілі, каб яны пасьпелі сысьці. І ў гэты час зьверху ўварваліся міліцыянты. У кватэры заставаліся я і яшчэ двое паплечнікаў. У гэты момант пачаўся сам вобшук. Сярод міліцыянтаў былі і супрацоўнікі Камітэту дзяржаўнай бясьпекі.**

# Апазіцыянераў караюць па ўказцы ўладаў



Старшыня Гарадоцкай арганізацыі Партыі БНФ, актывіст Руху "За Свабоду" працаўнік ГРУП ЖКГ "Гарадок" Леанід Аўтухоў працягвае абскарджваць незаконнае звальненьне. Спадар Аўтухоў накіраваў касацыйную скаргу ў Віцебскі абласны суд на рашэньне Гарадоцкага раённага суда, што не аднавіў яго на працы.

У скарзе актывіст спасылаецца на парушэньні наймальнікам міжнародных абавязкаў Беларусі адпаведна Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, Пастановы Пленуму Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 29.03.2001 г. № 2 "Аб некаторых пытаньнях ужываньня судамі заканадаўства аб працы", а таксама абавязкаў наймальніка выконваць пн. 6.11 Кантракту "Забясьпечыць выкананне заканадаўства аб працы, умоваў, якія устаноўленыя... пагадненьнем, іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі".

Звальненьне Леаніда Аўтухова адбылося з парушэньнем гэтых прававых дакументаў і актывіст спадзяецца, што абласны суд будзе карыстацца перш за ўсё нормамі права, а не палітычнымі матывамі.

Леанід Аўтухоў вылучаны кандыдатам ад АДС у выбарчай кампаніі Палаты прадстаўнікоў.

Кастуся Жукоўскага, гомельскага каардынатара аргкамітэту па стварэньні партыі "Беларуская хрысьціянская дэмакратыя", папярэдзілі пра звальненьне з працы.

Трэці год Жукоўскі працуе ў прыватнай фірме, якая аказвае паслугі таксі. Як паведаміў сам актывіст, кіраўнік фірмы выклікаў яго ў кабінет і паказаў улётку, што распаўсюджваў К.Жукоўскі. "Начальніку нехта прынёс гэтую ўлётку і запатрабаваў мяне звольніць, – упэўнены апазіцыянер. – Мне паставілі ўмову: альбо я спыняю ўсялякую палітычную дзейнасць, альбо 1 жніўня мяне звальняюць. Зрабіць гэта фірма ня мае права – у мяне падпісаны кантракт. Але я не хачу, каб у начальніка былі праблемы, да таго ж ён так робіць не па сваёй волі, таму я сам прыняў рашэньне звольніцца".

Дырэктар прыватнага прадпрыемства "Інтэргрань", дзе працуе апазіцыянер, адмовіўся каментаваць для БелаПАН прычыны звальненьня супрацоўніка. Толькі адзначыў, што істотных прэтэнзіяў да працы таксоўца ня мае.

На выбарах у верасьні К.Жукоўскі плануе вылучацца ў кандыдаты ў дэпутаты "парламента" па Буда-Кашалёўскай выбарчай акрузе. З гэтым ён зьвязвае ціск на працы. Актывіст плануе трапіць на прыём да намесьніка старшыні аблвыканкаму, выказаць сваё бачаньне палітычнай сітуацыі і нагадаць аб адказнасьці за палітычныя рэпрэсіі.

Уладзіміра Юрчанку, старшыню Магілёўскай раённай Кастрычніцкай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) зьнялі з пасады брыгадзіра будаўнічага ўпраўленьня энергетыкаў "Лаўсанбуд".

– Да мяне на працу прыйшоў супрацоўнік міліцыі, які пачаў распавядаць майму начальніку, што ёсьць непарадкі ў маёй працы, – кажа Уладзімір Юрчанка. – Нібыта праблемы тут і там, хаця нічога такога да гэтага моманту не было. Далей – больш. Ён прапанаваў кіраўніцтву мяне звольніць. Гэтае пытаньне вырашалася некалькі дзён. Кіраўніцтва прыйшло да высновы – не звальняць, але зьняць мяне з пасады брыгадзіра вартаўнікоў.

У выніку такога рашэньня апазіцыянер страціць прыблізна 100 тысячаў рублёў ад свайго былога заробку штомесяц.

– Тое, што да мяне раптоўна прыйшоў супрацоўнік міліцыі і кіраўніцтва пасьля яго прыходу мяне ледзь ня звольніла, – гаворыць Уладзімір, – на маю думку, зьяўляецца вынікам маёй палітычнай дзейнасьці.

Кіраўнік Віцебскай суполкі "Моладзі БНФ", прыхільнік "Руху "За Свабоду" Аляксандр Кузняцоў працаваў санітарам у хуткай дапамозе.

– На мінулым тыдні мяне выклікаў галоўны фельчар і паведаміў, што мной цікавяцца з органаў, – паведаміў Аляксандр Кузняцоў. – І мне прапанавалі напісаць заяву па асабістым жаданьні, у адваротным выпадку кіраўніцтва знойдзе прычыну, па якой мяне звольніць.

Цяпер Аляксандру Кузняцову прыйшла позва ад судовага выканаўцы. У яго дзьве судовыя справы па незаконным шэсьці са сьцягам 24 сакавіка і 26 красавіка. Аднак позвы ў суд яму яшчэ не дасылалі. "Атрымліваецца, што без мяне мяне судзілі", – адзначыў Аляксандр.

Аляксандр Кузняцоў мае жонку і двух дзяцей.

Бабруйчанку Таісію Кабанчук, якая зьбіраецца балатавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ад Асіповіцкай выбарчай акругі, зьбіраюцца звольніць з працы. Жанчына лічыць, што гэта зьвязана з яе рашэньнем прыняць удзел у выбарах.

"Мае праблемы з працай пачаліся пасьля таго, як у горадзе стала вядома, што я зьбіраюся вылучаць сваю кандыдатуру на выбары, – распавядае Таісія Кабанчук. – Бабруйскія супрацоўнікі КДБ раптам пачалі цікавіцца ў мясцовых дэмакратычных актывістаў, дзе я працую. А я яшчэ паўтары гады таму сьпецыяльна ўладкавалася на склад Баранавіцкай птушкафабрыкі, дзе працавала кладаўшчыцай, бо ведала, што ў сваім горадзе мне працу не знайсьці. Але яны дабраліся і туды! Я зьбіралася браць крэдыт, а загадчыца складу сказала мне: "Ды супакойся ты, ніякага крэдыту табе не дадуць, бо цябе павінны звольніць". Так я даведалася, што майму начальству дадзены загад на звальненьне".

Таісія Кабанчук адзначыла, што на птушкафабрыцы з ёй падпісалі кантракт на два гады. Ён павінен быў скончыцца ў лютым наступнага году, па дасягненьні жанчынай пенсійнага ўзросту.

"Зараз я чакаю канчатковага рашэньня начальства, але на лепшае не спадзяюся. Я даведалася ад калегаў, што ад кіраўніцтва птушкафабрыкі патрабавалі майго хуткага звальненьня".

8 ліпеня кобрынскаму актывісту Аляксандру Меху патэлефанавалі з пагрозамі. Вось што расказаў сам Аляксандр: "8 ліпеня 2008 году ў 12.11 мне патэлефанавалі на мабільны тэлефон. Я прыняў выклік. Той, хто тэлефанаваў, адразу пачаў нецэнзурна выказвацца, абражаць, пагражаць мне. Я перапыніў яго і сказаў: "Я больш ня буду з вамі размаўляць". Потым адключыў тэлефон. На маім апараце зафіксаваўся нумар абанента. У тэлефонным даведніку гэты нумар зарэгістраваны на прыёмную дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. На наступны дзень, 9 ліпеня, я падаў заяву на імя пракурора Кобрынскага раёна М.І.Запарошчанкі з патрабаваньнем знайсьці таго, хто пагражаў мне, каб прыцягнуць да адказнасьці паводле дзеючага заканадаўства. Я таксама сустрэўся з пракурорам і заявіў, што лічу гэтыя пагрозы зьвязанымі з маім намерам прыняць удзел у выбарах у парламент. Адказ на маю заяву абяцалі даць на працягу 10 дзён".

Мікалай Чарнавус — у сьпісе прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат ад АДС, вылучаны грамадзкім аб'яднаньнем "За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва". Разьлічвае балатавацца ў Баранавіцкай-Заходняй акрузе № 5. Актывіст сьцьвярджае, што за такія намеры ўлада пачала перасьлед — цяпер Чарнавуса пазбаўляюць выдзеленага раней зямельнага ўчастку для будаўніцтва кавярні:

"Я тры гады розныя паперы зьбіраў, грошы заплаціў, праектна-вышуковую працу робіць "Белжылпраект", што пры Міністэрстве жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Аднак замінае ўладзе, што Чарнавус вырашыў удзельнічаць у выбарах".

М.Чарнавус абскарджвае цяпер у Берасьцейскім аблвыканкаме рашэньне баранавіцкай улады адабраць у яго зямельны ўчастак.

"Санітарная служба склала пратакол паводле таго, што на рыдлёвачках, якія выраблены ў суседнім Кобрыне, не было этыкеткі. Аштрафавалі на 175 тысяч рублёў. Прасіўся я прасіўся: "Дайце хаця б да выбараў дажыць". Не! Загадалі плаціць".

Мікалай змушаны быў заплаціць чарговы штраф.

# Сістэмны палітычны перасьлед

## Па Беларусі прайшла хваля арыштаў іператрусаў сярод апазіцыянераў

Хваля ператрусаў і выклікаў у міліцыю пракацілася гэтымі днямі па краіне. Грамадзкіх актывістаў дапытвалі па справе выбуху 4 ліпеня.

Супрацоўнікі менскага КДБ з раніцы правялі ператрус на кватэры намесьніка старшыні МГА "Бацькаўшчына" ***Ніны Шыдлоўскай***.

Сп-ня Шыдлоўская паведаміла, што ператрус зьвязаны з выбухам 4 ліпеня, а яе муж ***Міраслаў Лазоўскі*** знаходзіцца ў сьпісах тых, каго варта праверыць. Шыдлоўская кажа, што ператрус пачаўся ў той момант, калі ў кватэры нікога не было. Цяжка таксама сказаць, ці было нешта канфіскаванае. Ніна Шыдлоўская кажа, што чакае мужа, каб разам азнаёміцца з пратаколам вобшуку.

8 ліпеня пяці салігорскім актывістам апазіцыі патэлефанавалі з міліцыі і папрасілі даць тлумачэньне, дзе яны былі ў ноч на 4 ліпеня, ці быў з іх нехта ў Менску.

"8 ліпеня бліжэй да поўначы, – кажа ***Іван Шыла***, – да мяне, майго брата ***Ільлі, Хрысьціны Самойлавай, Рыгора Астапені*** і ***Аляксея Валабуева*** патэлефанаваў старшы лейтэнант салігорскай міліцыі Салавей, які настойліва запрашаў заўтра зьявіцца ў пастарунак, каб даць пісьмовыя тлумачэньні, дзе мы знаходзіліся 3 і 4 ліпеня, ці быў нехта з нас у Менску".

Хлопец гаворыць, што ў Менску ў тыя дні нікога не было. Маладзёны знаходзіліся альбо ў Салігорску, альбо за мяжой.

Як паведамляе прэс-служба Руху "За свабоду", адбыўся ператрус на кватэры пінскага актывіста ***Паўла Ляхновіча***. Міліцыянты і супрацоўнікі пракуратуры з Менску паведамілі, што ператрус праходзіць у сувязі з заведзенай крымінальнай справай па выбуху 4 ліпеня. У Ляхновіча, які займаецца паляваньнем, канфіскавалі порах.

5 ліпеня міліцыянты з Чэрыкава і Клімавічаў дапыталі мясцовых журналістаў ***Сямёна Панізоўцава*** і ***Сяргея Аржанцава*** пра здарэньне ў Менску ў ноч на 4 ліпеня. У тым ліку пра выбух у Менску згадаў і ўчастковы міліцыянт, калі дапытваў іўеўскага актывіста Аб'яднанай грамадзянскай партыі Мікалая Уласевіча.

Гомельскі каардынатар па стварэньні "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі" ***Кастусь Жукоўскі*** атрымаў позву ў РУУС Цэнтральнага раёну. У позве адзначана, што 8 ліпеня яму неабходна зьявіцца да оперупаўнаважанага крымінальнага вышуку дзеля апытаньня наконт выбуху 4 ліпеня ў Менску.

Магілёўскага актывіста ***Зьміцера Салаўёва*** 9 ліпеня выклікалі па тэлефоне на гутарку ў якасьці сьведкі па крымінальнай справе, узбуджанай пасьля выбуху ў Менску 4 ліпеня.

***Сяржук Чыслаў*** быў арыштаваны 7 ліпеня і адвезены ў ізалятар на вуліцы Акрэсьціна. Пра гэта паведаміла маці актывіста ***Галіна Чыслава***, якая спаслалася на адваката сына і супрацоўнікаў КДБ, якія 8 ліпеня правялі ператрус на яе лецішчы пад Менскам.

Таксама супрацоўнікі КДБ правялі ператрус на кватэры яе дачкі Натальлі і забралі пусты пакет ад сочыва ды паўпустую бляшанку з лакам.

"Яны шукалі выбухоўку і казалі, што зараз сын за ўсё адкажа, маўляў, ён шмат чаго нарабіў. Але Сяргей ня мог нічога зрабіць супроць людзей, ён чалавек веруючы", – кажа Галіна Чыслава.

Паводле яе словаў, больш за год таму Сяржук Чыслаў зьехаў у Маскву, дзе займаўся бізнэсам. Пра тое, што ён знаходзіўся ў Менску падчас сьвятаў, яго маці ня ведала.

## Сьпецназ ня даў правесьці акцыю салідарнасьці

**На Кастрычніцкай плошчы ў Менску была разагнаная акцыя з патрабаваньнем вызваліць актывістаў апазіцыі, арыштаваных пасьля выбуху 4 ліпеня. У 18.00 каля 50-ці прадстаўнікоў палітычных партыяў і рухаў сабраліся на Кастрычніцкай плошчы на знак пратэсту супраць узмацненьня рэпрэсіяў у дачыненьні да актывістаў дэмакратычнай супольнасьці. Актывісты АДС патрабавалі вызваліць затрыманых актывістаў, якіх трымаюць у сьледчым ізалятары як падазроных у выбуху падчас сьвяточнага канцэрту 4 ліпеня.**

**Дэманстрантаў выцесьнілі з Кастрычніцкай плошчы і павялі вуліцай Янкі Купалы.**

**Насустрач дэманстрантам, якіх вяло ачапленьне сьпецназу міліцыі, рухалася калона суворваўцаў – у іх быў выпускны баль. Міліцыянты разьвялі дзьве калоны – адна прайшла па левым баку вуліцы, другая – па правым.**

**Цікава, што ўвесь час калону суправаджалі двое асобаў блізкаўсходняй зьнешнасьці, якія ўвесь час выкрыквалі лозунгі, крычалі дэманстрантам, што яны ўсе "прадаліся ЗША", "служаць Бушу" і падобнае. Сьпецназаўцы не дазвалялі рабіць ім заўвагі, і гэтак яны прайшлі за калонай да вуліцы Максіма Багдановіча. На скрыжаваньні вуліцы Варвашэні і Багдановіча каля казіно "Белая вежа" дэманстранты і сьпецназаўцы раптам убачылі пусты пакет з-пад соку, і гэта выклікала сьмех і ў адных і ў другіх.**




**Урэшце пачуўся загад – нікога не затрымліваць. Спачатку дазволілі сысьці з натоўпу Віктару Івашкевічу, а потым далі разыйсьціся іншым дэманстрантам. На Кастрычніцкай плошчы быў моцна зьбіты амапаўцамі лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. Пасьля зьбіцьця палітык зьвярнуўся ў 2-ю клінічную лякарню Менску. Урачы засьведчылі шматлікія гематомы на грудзях і нагах Лябедзькі.**

**Тых дваіх, якія ўвесь час гучна абражалі людзей, узялі двое сьпецназаўцаў, пад аховай адвялі ў бок і адпусьцілі.**

**Падзею пракаментаваў намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч: "Гэтая акцыя нагадала мне час пачатку перабудовы, калі з аданого боку і біць людзей не сезон, бо трэба добра выглядаць для Еўропы, але і дэмакратыю дазваляць асабліва нельга. Таму і атрымалася такая сюррэалістычная карцінка, калі 50 амапаўцаў і 50 дэмакратычных актывістаў на працягу гадзіны ідуць па вуліцах сталіцы пад сьцягам Еўразьвязу. Чаму так доўга ішлі? Бо ў сістэме, рашэньні прымае адзін чалавек, і яныпраходзяць вельмі доўгі ланцуг, пакуль спусьцяцца ад вышэйшага чыноўніка да шараговых выканаўцаў".**

Актывістка з Менску ***Тацяна Пікун*** знаходзіцца ў Ізалятары часовага затрыманьня на Акрэсьціна. Паводле папярэдняй інфармацыі, дзяўчыну затрымалі 7 ліпеня ў якасьці сьведкі па крымінальнай справе, распачатай па факце выбуху ў Менску 4 ліпеня.

Як стала вядома праваабаронцам, у гэтым жа ізалятары зьмяшчаецца ***Віктар Ляшчынскі*** па падазрэньні ў начным "выбуху".

Супрацоўнікі КДБ затрымалі ***Ігара Корсака***. Яны прыйшлі за Ігарам 8 ліпеня ўвечары зператрусам, падчас якога знайшлі ў кватэры пакет з балтамі і гайкамі, а таксама гумовыя пальчаткі. Яго цешча ***Тацяна Цяцеркіна*** паведаміла, што ў кампутары супрацоўнікі КДБ шукалі інфармацыю па слове "траціл", але нічога не знайшлі, забралі так званыя "рэчавыя доказы" і затрымалі зяця.

Ігара дапытвалі на Казлова, 4 (адміністрацыйны будынак Інстытуту нацыянальнай бясьпекі). Ён пасьпеў патэлефанаваць сваякам і паведаміў, што яго падазраюць у вырабе выбуховага прыстасаваньня і на 3 сутак вязуць у Ізалятар часовага ўтрыманьня.

Цешча Ігара Корсака абураная дзеяньнямі супрацоўнікаў КДБ. Яна лічыць, што ў гаспадарцы кожнай кватэры знойдуцца і балты, і гайкі, і гумовыя пальчаткі. Жанчына паведаміла, што раней Ігар актыўна ўдзельнічаў у грамадзка-палітычным жыцьці і стаяў на ўліку як апазіцыянер.

Лідэрку нясьвіскай філіі Маладога Фронту ***Насту Азарку*** 8 ліпеня выклікалі ў мясцовы аддзел КДБ на гутарку наконт выбуху ў Менску. Супрацоўнікі КДБ высьвятлялі, ці ведае Наста акалічнасьці выбуху, дзе яна знаходзілася ў ноч на 4 ліпеня, паказвалі фотаробат магчымага арганізатара тэракту.

9 ліпеня ў Астравецкім раёне дадому да сябра АГП ***Ягора Краснова*** прыйшлі два супрацоўнікі Астравецкага РАУС, каб высьветліць, дзе моладзевы актывіст правёў ноч з 3 на 4 ліпеня, калі ў Менску адбыўся выбух. У адсутнасьць Ягора Краснова пісьмовае тлумачэньне аб ягоным знаходжаньні было ўзятае ў маці ***А.В. Віткоўскай***. Пры гэтым міліцыянтаў цікавіла ня толькі ноч на 4, але і дзе яе сын правёў апошнія 10 дзён, якія папярэднічалі тэракту ў Менску. Як сьведчыць Віткоўская, на руках у міліцыянтаў быў даволі вялікі сьпіс асобаў, якія трапілі пад падазрэньне ў сувязі з тэрактам у Менску.

Берасьцейскі актывіст апазіцыі ***Дзяніс Турчаняк*** быў дапытаны міліцыяй у сувязі з расьсьледаваньнем справы аб выбуху ў Менску.

Як паведаміў праваабаронца ***Раман Кісьляк***, на мабільны тэлефон актывісту патэлефанаваў супрацоўнік крымінальнага вышуку і паведаміў, што ён павінен тэрмінова зьявіцца ў аддзел унутраных справаў Маскоўскага раёну Берасьця па справе аб выбуху ў сталіцы.

Размова доўжылася прыкладна 50 хвілінаў. У Турчаняка пыталі, дзе ён знаходзіўся, калі ў Менску адбыўся выбух. Апрача таго, актывісту прапанавалі здаць адбіткі пальцаў і ўзор ДНК. Ад апошняга ён адмовіўся, як і ад таго, каб быць зьнятым у міліцыі на фота і відэа, – зазначыў праваабаронца.

Падчас размовы Турчаняк пацікавіўся, чаму гутараць з ім у межах гэтай крымінальнай справы. На што яму адказалі: апытваюць усіх, хто раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасьці, і псіхічна нездаровых людзей. Варта зазначыць, што Дзяніс Турчаняк ні да адной з гэтых групаў не адносіцца.

14 ліпеня стала вядома, што па справе выбуху быў затрыманы грамадзянін Расіі. Гэта 21-гадовы ***Уладзімір Бялунін***. Ён навучаецца ў адной з менскіх ВНУ. Бацькі затрыманага сьцьвярджаюць, што ён моцна хворы, і ня можа нават нармальна харчавацца. Паведамляецца, што Бялуніна затрымлівалі некалькі разоў. Спачатку 4 ліпеня пасьля іспыту, тады ж быў праведзены ператрус у кватэры, дзе ён жыве з бацькамі, былі забраныя сістэмны блок кампутара і мабільны тэлефон студэнта. Другі раз расіянін быў затрыманы 9 ліпеня.

Актывіста Лідзкай філіі Маладога Фронту ***Вадзіма Бароўскага*** 15 ліпеня выклікалі ў міліцыю для дачы тлумачэньняў па выбуху 3 ліпеня ў Менску.

Пасьля допыту міліцыянты А.І.Вацкан і Р.І.Сухоцкі адвезьлі маладафронтаўца на кватэру, каб правесьці вобшук. Пры гэтым, як зазначае Вадзім, ордэру на вобшук міліцыянты ня мелі.

Пасьля таго, як Вадзім выказаў прэтэнзіі з нагоды беспадстаўнага вобшуку, міліцыянты вырашылі апячатаць кватэру і адвезьці маладафронтаўца ў РАУС.

У выніку вобшуку былі канфіскаваныя некаторыя інфармацыйныя матэрыялы, датычныя Маладога Фронту і БХД. Вадзіма Бароўскага адпусьцілі.

12 ліпеня у Калінкавічах у дзьверы кватэры ***Дзяніса Рабянка*** пазваніў участковы міліцыянт Э.І.Драбышэўскі і сказаў, што яму тэрмінова трэба паразмаўляць з Дзянісам Леанідавічам. Маці Дзяніса адказала, што яго няма дома. Участковы сказаў, што хоча зайсьці і паглядзець, ці няма сына дома на самой справе. Маці адказала, што дзьверы яму не адчыніць, і ён сышоў. 15 ліпеня ў паштовай скрыні Дзяніс Рабянок знайшоў позву, дзе ўсё той жа участковы Э. І. Драбышэўскі выклікаў Дзяніса на 16 ліпеня а 10.00. на допыт у якасьці сьведкі. Дзяніс вырашыў пайсьці. У прызначаны час Дзяніс быў у кабінеце участковага Э.І.Драбышэўскага. На пытаньне, з чым зьвязаны выклік, участковы адказаў, што па меркаваньні сьпецслужбаў, Дзяніс падобны на складзены пасьля выбуху 4 ліпеня фотаробат злачынцы, і што яму далі загад яго апытаць. Акрамя таго, участковы спытаў, дзе Дз. Рабянок знаходзіўся 3 ліпеня. Дзяніс адказаў што і 3, і 4 ліпеня быў дома, за межы горада не выязджаў, пацьвердзіць гэта можа яго маці. Гэта таксама было занесена ў пратакол. На тым размова скончылася.

Свой дваццаць першы дзень нараджэньня актывіст Партыі БНФ, праваабаронца ***Ільля Богдан*** сустрэў за кратамі – юнака падазраюць ва ўчыненьні выбуху ў Менску 4 ліпеня. Яшчэ 10 ліпеня ўвечары на кватэры, дзе Ільля жыве з бацькамі, прайшоў ператрус, які зрабілі супрацоўнікі КДБ. Пасьля ператрусу актывіста затрымалі і даставілі на допыт. Доўгі час ні сябры, ні родныя, ні нават адвакат не маглі даведацца, куды даставілі затрыманага актывіста. Толькі праз два дні высьветлілася, што Ільля ўтрымліваецца ў РУУСе Маскоўскага раёну. Стала таксама вядома, што некаторы час Богдана трымалі ў так званай "камеры-стакане", каб псіхалагічна падавіць ягоную волю.

Цікава, што нягледзячы на тое, што Ільлю затрымалі нібыта па падазрэньні ва ўчыненьні выбуху, тым ня меней, распытвалі яго найперш пра праваабарончую дзейнасьць, пра тое, ці ўдзельнічае ён у выбарчай кампаніі.

У Мазыры 16 ліпеня а 8-й гадзіне па тэлефоне былі запрошаныя ў РАУС у якасьці сьведкаў сябры Мазырскай раённай суполкі Партыі Камуністаў Беларускай (ПКБ) ***Уладзімір Жогла*** і ***Яўген Брусніцын*** (65 і 70 гадоў). Цікавіліся іх дачыненьнем да выбухаў у Менску 3-4 ліпеня. Самым крыўдным для ветэранаў, адстаўных афіцэраў была працэдура зьняцьця адбіткаў пальцаў і фотаздымкі анфас-профіль пад пэўным нумарам.

Сябра палітрады Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Аляксандра Дабравольскага*** 16 ліпеня дапыталі ў КДБ па справе аб выбуху ў Менску.

Паводле яго словаў, супрацоўнікі сьпецслужбаў цікавіліся магчымай датычнасьцю да выбуху былога ўдзельніка незарэгістраванай арганізацыі "Правы альянс" ***Юрыя Карэтнікава***.

Дабравольскі пацьвердзіў, што разам з Карэтнікавым 4 ліпеня знаходзіўся ў Страсбургу ў летнім універсітэце, арганізаваным у рамках Усходнееўрапейскай школы палітычных дасьледаваньняў. Дабравольскі падкрэсьліў, што "Карэтнікаў не зьяўляецца прыхільнікам гвалтоўных дзеяньняў". Таксама на допыты выклікаліся сябра палітрады АГП ***Валянціна Палевікова*** і актывіст Партыі БНФ ***Аляксандр Шарафановіч***, якія таксама былі ў Страсбургу.

Журналістаў недзяржаўнай маланакладнай крычаўскай газеты "Вольны горад" (Магілёўская вобл.) супрацоўнікі міліцыі апыталі з нагоды выбуху 4 ліпеня ў Менску. Як паведаміў рэдактар "Вольнага гораду" ***Сяргей Няроўны***, міліцыянты 22 ліпеня наведаліся ў прыватнае жыльлё да яго, а таксама да заснавальніка газеты ***Уладзіміра Кудраўцава*** і супрацоўніка рэдакцыі ***Мікалая Гердзія***.

*(Працяг на стар. 12)*

# Сістэмны палітычны перасьлед

(Пачатак на стар. 11-12)

Па словах С. Няроўнага, Уладзіміра Кудраўцава адвялі для гутаркі ў міліцэйскую машыну. Задавалі пытаньні наконт захаваньня зброі, судзімасьцяў і г.д. У канцы размовы яму прапанавалі падпісаць дакумент, што ён азнаёмлены з занатаваным.

Паколькі Мікалая Гердзія падчас візіту міліцыянтаў не аказалася дома, на пытаньні мусіла адказваць яго суседка. Міліцыю цікавіла, як паводзіць сябе сп. Гердзій у сям'і, ці не скандаліць.

Сяргей Няроўны расцэньвае такія паводзіны мясцовай міліцыі як спробу псіхалагічнага ціску.

29 ліпеня больш за гадзіну правёў на допыце ва ўпраўленьні КДБ па Гарадзенскай вобласьці кіраўнік абласной суполкі партыі БНФ ***Сяргей Мальчык***. Перадусім службоўцаў цікавіла, дзе быў апазіцыянер падчас менскага выбуху.

Сяргей Мальчык за свае палітычныя погляды неаднойчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе тэрмінаў зьняволеньня і штрафаў у буйных памерах. Некалькі разоў яго дапытвалі супрацоўнікі КДБ наконт актыўнай апазіцыйнай дзейнасьці.

Як паведаміў актывіст грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" ***Максім Вінярскі***, яму патэлефанаваў на мабільны тэлефон чалавек, які прадставіўся "працаўніком КДБ Аляксандрам Мікалаевічам" і настойліва прасіў прыйсьці ва Упраўленьне КДБ па Менску і Менскай вобласьці. Падставай для допыту ён назваў выбух у Менску 4 ліпеня. Пры гэтым супрацоўнік КДБ адмовіўся назваць сваё прозьвішча і даслаць афіцыйную позву актывісту. Акрамя таго, ён "настойліва" прасіў Максіма Вінярскага "не ставіць нікога ў вядомасьць" аб выкліку на допыт.

29 ліпеня быў выкліканы ва Упраўленьне КДБ па Менску і Менскай вобласьці дэмакратычны актывіст ***Алег Корбан***. "Чалавек, які мне патэлефанаваў, прадставіўся супрацоўнікам КДБ, але прозьвішча сваё не назваў. Акрамя таго, ён пытаўся, як можна знайсьці моладзевых актывістаў ***Уладзіміра Сяргеева*** і ***Ягора Баброва***. Мабыць, іх таксама будуць выклікаць на допыты", – паведаміў Алег Корбан.

У Гародні праваабаронцу і грамадзкага дзеяча ***Віктара Сазонава*** 31 ліпеня выклікалі на 11 гадзінаў у Ленінскі РАУС Гародні. Выклік у міліцыю зьвязаны з выбухам у Менску у ноч з 3 на 4 ліпеня.

Тыдзень таму Віктар Сазонаў ужо выклікаўся ў КДБ па аналагічным пытаньні, а праз пару дзён двойчы беспадстаўна затрымліваўся на мяжы. Сярод іншых пытаньняў сьпецслужбоўцы тады цікавіліся службай у войску, якую Віктар Сазонаў адбыў ажно 25 гадоў таму. Сазонаў заявіў, што паводле вайсковай сьпецыяльнасьці ён разьведчык, а не падрыўнік.

Міліцыянты заявілі, што ім патрэбныя біяметрычныя дадзеныя праваабаронцы. Сам Віктар Сазонаў перакананы, што пад выглядам сьледзтва па справе выбуху ў Менску, улады ажыцьцяўляюць сістэмны палітычны перасьлед актыўных удзельнікаў і назіральнікаў выбарчай кампаніі.

Увечары 12 ліпеня з ізалятару КДБ выпусьцілі затрыманых па справе аб выбуху 4 ліпеня ***Сяргея Высоцкага, Паўла Кур'яновіча*** і ***Аляксандра Сергіенку***.

Сяргей Высоцкі распавёў, што яго затрымалі 10 ліпеня пасьляператрусу ў кватэры. Сяргея падазравалі па справе аб выбуху 4 ліпеня паводле артыкулу 339 часткі 3 (злоснае хуліганства). Ахоўнікі ў “амерыканцы”, якія кожныя 5 хвілінаў заглядвалі ў камеру, міжсобку называлі яго тэрарыстам.

Было некалькі допытаў, у часе якіх Сяргея дапытвалі аб тым, што ён рабіў у ноч з 3 на 4 ліпеня. Аднак Высоцкі здолеў давесьці сваё алібі.

Сьледчыя КДБ ўзялі з Сяргея падпіску аб нявыезьдзе і неразгалошваньні таямніцы сьледзтва.

Паводле спадара Высоцкага, разам з ім на волю выпусьцілі і Аляксандра Сергіенку, аднаго з лідэраў моладзевага крыла АГП – арганізацыі “Маладыя дэмакраты”.

Сяргей Высоцкі зьяўляецца каардынатарам Беларускага нацыянальна-дэмакратычнага цэнтру ў Кіеве, ён узначальваў незарэгістраваную Беларускую партыю свабоды.

## Міраслаў Лазоўскі:
# "У турме не было ніводнага допыту"

Міраслаў Лазоўскі – адзін з чатырох былых сяброў "Белага легіёну", якія былі затрыманыя на 10 сутак арышту па падазрэньні ў выбуху ў Менску. 18 ліпеня Лазоўскі разам з Сяргеем Чыслававым, Ігарам Корсакам і Віктарам Ляшчынскім выйшаў на волю...

***– Як адбывалася затрыманьне?***

– 8 ліпеня мне на працу патэлефанаваў супрацоўнік КДБ, які паведаміў, што ў маёй кватэры адбываецца ператрус, і яны хочуць мяне таксама бачыць. Недалёка ад працы мяне і затрымалі, адвезьлі ў гарадзкое ўпраўленьне КДБ, дзе правялі апытаньне, а ўжо потым мяне адвезьлі ў сьледчае ўпраўленьне МУС, дзе адбыўся ўжо паўнавартасны допыт. Найперш цікавіліся дзейнасьцю "Белага легіёну". Я тлумачыў, што арганізацыя гэтая мела патрыятычныя, а не тэрарыстычныя мэты, што нічога крымінальнага ў нашай дзейнасьці не было. Мне на гэта адказвалі, што па іхных зьвестках, некалі "легіёнаўцы" мелі дастатковую падрыхтоўку, каб зьдзейсьніць падобны выбух. Для мяне такі паварот падзеяў быў абсалютна нечаканы. Ужо некалькі гадоў я ня ўдзельнічаў у палітычным жыцьці. Пра колішняе сяброўства ў "Белым легіёне" пасьпеў нават забыцца. Як бачым, людзі, якія мяне арыштоўвалі, пра гэта не забыліся. Мяне арыштавалі з афіцыйнай трактоўкай: "непасрэдна ўзьніклае падазрэньне". Так я апынуўся на Акрэсьціна.

***– А пра арышты іншых сяброў "Белага легіёну" калі пачулі?***

– Яшчэ ў ізалятары, бо ў турме сядзелі ў адной камеры з Сяргеем Чыслававым. Толькі першую ноч я правёў у адзіночнай камеры. Пасьля мяне перавялі да звычайных злачынцаў, а ўжо апошні тыдзень я апынуўся разам з іншымі падазранымі ў выбуху. Мне здаецца, што ім проста не хапала вольных месцаў. Камеры на Акрэсьціна былі перапоўненыя. Апошні тыдзень нас было пяцёра чалавек. Апроч мяне і Чыслава ў камеры таксама знаходзіліся студэнт біялагічнага факультэту, кампутарнік з Воршы, як мы зразумелі, ён напісаў нешта пра выбух на адным форумаў (увогуле, ён быў досыць закрыты чалавек), а таксама заводзкі рабочы, які некалі сядзеў за захоўваньне зброі. Усіх іх ужо выпусьцілі на волю.

***– Допыты праводзіліся часта?***

– У тым і справа, што ніякіх допытаў у турме не было. Мяне дапыталі толькі ў дзень затрыманьня ў КДБ і міліцыі, а пасьля – цішыня. Здаецца, што ў ізалятары не дапытвалі нікога з затрыманых па справе выбуху. Бралі толькі кроў на эксьпертызу. Фактычна нас трымалі ў поўным няведаньні, што адбываецца і калі нас вызваляць.

***– А па Вашых падліках колькі ўвогуле чалавек магло знаходзіцца ў ізалятары па падазрэньню ў выбуху?***

– Найменей пару дзясяткаў чалавек. Але дакладную лічбу сказаць цяжка.

***– А Вам паведамілі, на які тэрмін адбываецца затрыманьне?***

– Я ведаў, што стандартная працэдура затрыманьня – трое сутак. У выпадку асабліва цяжкіх злачынстваў маглі працягнуць знаходжаньне ў ізалятары да 10 дзён. У прынцыпе, быў спакойны, бо ведаў, што ніякіх доказаў няма. Ці хваляваўся, што могуць ня вызваліць 18 ліпеня? Ведаеце, у турме і так ня соладка, а калі забіваць галаву рознымі дурнымі думкамі, то цяжэй удвая. Стараўся пра гэта ня думаць.

Алесь АНЦІПЕНКА:

# "Журналіст – адвакат інтарэсаў чытачоў"

***Якую ролю адыгрываюць беларускія СМІ ў выбарчай кампаніі? Пра гэта прэс-служба БАЖ вядзе гутарку з медыя-эксьпертам Алесем Анціпенкам.***

***– Спадар Анціпенка, вы маеце досьвед маніторынгу беларускіх сродкаў масавай інфармацыі падчас выбарчых кампаніяў 2001, 2004 і 2006 гадоў. Ці можаце адзначыць галоўныя тэндэнцыі і адметныя рысы дзейнасьці беларускіх СМІ напярэдадні выбараў?***

– Калі спасылацца на мінулы досьвед маніторынгу дзейнасьці СМІ падчас выбарчай кампаніі, то агульная тэндэнцыя – маргіналізацыя тэмы выбараў. Выбары не былі ў цэнтры ўвагі сродкаў масавай інфармацыі, яны разглядаліся як неістотная зьява, у якой няма інтрыгі, а вынікі вядомыя наперад. Прынамсі, гэта тычылася выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы. Тая ж тэндэнцыя была характэрнай для парламенцкіх выбараў 2004 году. Інфармацыя аб кандыдатах, правілах запаўненьня бюлетэняў была даступная, з большага толькі на выбарчых акругах.

Беларускія СМІ падчас выбарчай кампаніі не ствараюць роўных магчымасьцяў для ўсіх кандыдатаў. У нас увогуле адсутнічаюць дэбаты. Дэбаты ў СМІ – важная частка выбарчай кампаніі, бо гэта жывая дынамічная сувязь, якая дае магчымасьць пабачыць чалавека і кандыдата, які рэагуе на спантанныя сітуацыі. На жаль, гэты жывы элемент асьвятленьня выбараў у нас адсутнічае.

Калі гаварыць пра дзяржаўныя медыя – электронныя і друкаваныя, – у іх пераважае пазітыўнае адлюстраваньне кандыдатаў ад улады і стварэньне негатыўнага вобразу апазіцыі.

***– Але ж пазітыўнае адлюстраваньне дзейнасьці кандыдатаў у той жа ступені характэрна для недзяржаўных медыяў. На старонках незалежных беларускіх выданьняў падчас выбараў можна знайсьці тую ж прапаганду – толькі на карысьць апазіцыйных палітыкаў. Чаму вы робіце акцэнт менавіта на дзяржаўных сродках масавай інфармацыі?***

– Дзяржаўныя медыя атрымліваюць грошы з бюджэту. Таму можна сказаць, што гэта грамадзкія сродкі масавай інфармацыі. А падчас выбараў грамадзкія СМІ, на маю думку, маюць абавязкі перад выбаршчыкамі (бо з іх падаткаў і падтрымліваюцца медыя).

Яны мусяць строга прытрымлівацца правіла роўных магчымасьцяў для кандыдатаў. Гэта азначае, што ўсе кандыдаты мусяць атрымліваць роўны час, роўную плошчу ў дзяржаўных медыях. Кандыдаты мусяць мець права на адказ, калі журналісты ці іншыя кандыдаты зрабілі памылку, калі кандыдат не пагаджаецца з іх аргументамі. У гэтым выпадку кожны з удзельнікаў выбарчай кампаніі павінен мець магчымасьць выкласьці контраргументы, давесьці свой погляд. Гэты элемент асьвятленьня выбарчай кампаніі фактычна адсутнічае ў дзаржаўных медыях.

Да медыяў, якія зьяўляюцца бізнес-праектамі, мы ня можам апеляваць, бо гэта – прыватная справа. Яны маюць права прадаваць эфірны час альбо газетную плошчу, і гэта не іх абавязак – прадастаўляць роўныя магчымасьці. Камерцыйныя медыя больш вольныя ў адбудове сваёй інфармацыйнай палітыкі падчас выбарчай кампаніі.

Але гэта не азначае, што ў рэальнасьці яны зьяўляюцца агентамі ўплыву аднаго кандыдата. Яны зацікаўленыя ў тым, каб пашырыць сваю аўдыторыю, бо гэта, безумоўна, падвышае рэйтынг медыяў.

Але і ў выпадку з партыйнай прэсай, як і з бізнес-выданьнямі, дзейнічае толькі звычайны набор журналісцкіх правілаў – кодэкс журналісцкай этыкі.

***– Гаворачы пра журналісцкую этыку, трэба адзначыць, што дзейнасьць СМІ падчас выбарчай кампаніі на Захадзе, напрыклад, рэгулюецца асаблівымі прапісанымі правіламі. Што гэта за правілы?***

– Ёсьць цэлы набор стандартаў, важных для асьвятленьня выбарчай кампаніі. Гэтыя стандарты добра вядомыя на Захадзе. Выданьні мусяць падаваць погляды кандыдатаў карэктна, ясна, не зацямняючы сутнасьць, не працуючы на аднаго кандыдата. Яны павінны данесьці да чытачоў погляды розных кандыдатаў, партыяў. Падчас выбарчай кампаніі СМІ павінны ўстрымлівацца ад каментароў і ўласных ацэнак.

Яны мусяць больш уважліва ставіцца да таго, каб зразумела паведамляць чытачу, у якім жанры пададзены матэрыял – каментар ці інфармацыя. Абавязак выданьня – адукаваць выбаршчыкаў. Выбаршчыкі мусяць ведаць, дзе і калі яны будуць галасаваць, як выглядае працэдура, як дзейнічаюць выбаркамы, як адбываецца назіраньне за выбарамі…

***– Карэктнасьць, роўныя ўмовы, непрадузятасьць – гэта, безумоўна, добра, але шмат хто з нашых калегаў лічаць такія паводзіны раскошай, недасягальнай для тых, хто існуе ў беларускай рэчаіснасьці.***

– Ёсьць шэраг правілаў, якія ня трэба тлумачыць журналістам тых краінаў, дзе існуюць традыцыі свабодных і роўных выбараў. Але і ў нас журналісты і выданьні не павінны мець карт-бланш на ігнараваньне правілаў і прафесійных стандартаў. Бо тады дзейнасьць выданьня можа мець дачыненьне да прапаганды, а не да прафесійнай журналістыкі.

Калі вы хочаце даведацца, ці працуюць у тым ці іншым выданьні прафесійныя журналісты, пачытайце яго падчас выбараў. Бо журналіст, які можа захапіць чытача разважаньнямі аб хрызантэмах, гэта не журналіст. Пісаць пра хрызантэмы лёгка. Цяжка пісаць аб тым, што можа патрабаваць выбару. Аб прафесійнасьці журналіста можна казаць тады, калі ён змог пазьбегнуць спакусы пераконваць сваіх чатачоў у слушнасьці таго выбару, які ён зрабіў для сябе. Пазьбегнуць спакусы стаць на чыйсьці бок – тым больш на бок улады. Трэба памятаць, што журналіст – перадусім адвакат інтарэсаў сваіх чытачоў і тых каштоўнасьцяў, якія называюцца дэмакратычнымі.

# Канстытуцыйны суд "заплюшчыў вочы" на новы Закон аб СМІ

Канстытуцыйны суд Беларусі ў рамках сваіх паўнамоцтваў папярэдняга кантролю законапраектаў разгледзеў праект закону аб СМІ і не знайшоў у ім прамой супярэчнасьці Канстытуцыі.

"Мы разглядалі праект закону аб СМІ, аналізавалі ўсе ягоныя нормы, якія рэгламентуюць дзейнасьць СМІ, прамой супярэчнасьці нормам Канстытуцыі, у прыватнасьці, арт. 33 і 34 мы ня ўгледзелі", – заявіў старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі Пётр Міклашэвіч на прэс-канферэнцыі ў Менску.

Разам з тым "калі практыка рэалізацыі і ўжываньня пойдзе ў іншым асьпекце, Канстытуцыйны суд гатовы вярнуцца да гэтага закону".

Праект закону аб СМІ прыняты ў двух чытаньнях ніжняй палатай парламенту і ўхвалены верхняй палатай у чэрвені гэтага году. Аднак закон дагэтуль не падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам. Закон уводзіць забарону на рэгістрацыю СМІ, заснавальнікамі якіх зьяўляюцца замежнікі, пашырае дзеяньне закону на інтэрнэт-СМІ, скарачае магчымасьці журналіста на атрыманьне інфармацыі, у прыватнасьці, выключае абавязак дзяржчыноўнікаў падаваць інфармацыю па запытах СМІ.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# "Бяз гэтага сяло мы ня выратуем..."

### Разьмеркаваньне можа стаць яшчэ больш падобным да «прыгоннага права»

Падчас нядаўняй нарады ў Камянецкім раёне А.Лукашэнка фактычна прызнаў, што сістэма прымусовага разьмеркаваньня не дае жаданых вынікаў. Нават выпускнікі сельскагаспадарчых ВНУ пасьля заканчэньня абавязковых двух гадоў часта зьмяняюць месца працы. Аднак, замест таго, каб прыцягваць маладых сьпецыялістаў у малапрыцягальныя месцы праз паляпшэньне ўмоваў працы, у Беларусі, верагодна, яшчэ больш жорсткай стане сістэма прымусовага разьмеркаваньня выпускнікоў ВНУ. Са словаў Лукашэнкі вынікае, што зьмены закрануць выпускнікоў сельскагаспадарчых і медыцынскіх ВНУ.

«Паступіў у сельскагаспадарчую ВНУ — ідзі і працуй на сяло. Нікому ня будзе дазволена проста адпрацаваць нейкі тэрмін па разьмеркаваньні і перайсьці на іншую працу. Без дазволу старшыні райвыканкаму ніхто ня зможа перайсьці на іншую працу. Мы прыдумаем, як гэта зрабіць, каб не наламаць дроваў. Вось і ўся дэмакратыя. Але бяз гэтага сяло мы ня выратуем, як і ахову здароўя», — заявіў выпускнік Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі Аляксандр Лукашэнка.

На рэзкія заявы дзейнага прэзідэнта Беларусі пра прымусовае разьмеркаваньне выпускнікоў спасылаецца Interfax.

Нагадаем, прымусовае разьмеркаваньне студэнтаў было адноўленае ў Беларусі ў 1997 годзе, але да апошніх зьменаў фінансавая адказнасьць за адмову ад разьмеркаваньня ляжала не на выпускніках, а на працадаўцах, якія маглі «перахапіць» сьпецыяліста ў арганізацыі, вызначанай дзяржавай. І многія маладыя сьпецыялісты адмаўляліся ад непрывабных працоўных месцаў па разьмеркаваньні, працавалі два гады неафіцыйна, а потым уладкоўваліся на самастойна абраную працу.

Паводле апошніх зьменаў у заканадаўстве пра разьмеркаваньне ў 2006 годзе, выпускнікі бюджэтнай формы навучаньня вышэйшых, сярэдніх сьпецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установаў мусяць адпрацаваць па разьмеркаваньні год і два гады адпаведна. А той, хто ня едзе працаваць па разьмеркаваньні, павінен сам аплаціць кошт свайго навучаньня. Такая норма фактычна зьнішчыла бясплатную адукацыю ў Беларусі. А на выпускнікоў пасыпаліся зыскі за адмову ад разьмеркаваньня.

Так, ужо на момант кастрычніка 2007 году было заведзена 100 крымінальных справаў на выпускнікоў, што адмовіліся ехаць па прымусовым разьмеркаваньні. Усяго ж у мінулым годзе было разьмеркавана болей за 19 тысячаў выпускнікоў. Многія маладыя сьпецыялісты сапраўды абіраюць шлях адпрацаваць па разьмеркаваньні адведзеныя два гады, а потым шукаць лепшыя ўмовы для працы самастойна. Так, паводле статыстыкі на красавік 2008 году у чарнобыльскіх рэгіёнах застаюцца працаваць толькі 27% разьмеркаваных выпускнікоў.

# ВНУ "ачышчаюцца" ад выдатнікаў

Актывіст Маладога Фронту Алесь Круткін, студэнт першага курсу гістарычнага факультэту БДУ, па вяртаньні з-за мяжы даведаўся, што ён выключаны з універсітэту.

Падставай дзеля выключэньня маладафронтаўца стала парушэньне ўнутранага распарадку універсітэту, што выяўлялася ў шматлікіх затрыманьнях і неаднаразовай адміністрацыйнай адказнасьці Алеся. За актыўную палітычную дзейнасьць Алесь Круткін двойчы атрымліваў строгія вымовы ад адміністрацыі, і яму нават было прапанавана перавесьціся на завочнае навучаньне, ад чаго маладафронтавец адмовіўся.

Адзначым, што Алесь зьяўляецца пераможцам рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі Беларусі і ва універсітэт юнак быў прыняты без уступных іспытаў. На сваім курсе Алесь Круткін лічыцца лепшым студэнтам.

Пасьля размовы з дэканам факультэту, актывісту Маладога Фронту, студэнту першага курсу Магілёўскага універсітэту імя Куляшова Расьціславу Панкратаву паведамілі, што яго выключаюць з універсітэту.

– Ціск на мяне пачаўся яшчэ з восені 2007 году, калі мяне пачалі выклікаць на размовы супрацоўнікі КДБ, – гаворыць Расьціслаў. З красавіка гэтага году на мяне пачалі ціснуць праз дэканат. Мне неаднаразова прапаноўвалі забраць дакументы з універсітэту па сваім асабістым жаданьні, але я адмаўляўся. Трэба адзначыць, што першую сесію я здаў пасьпяхова, без пераздачаў. На другой жа мяне проста завалілі. Да першага іспыту мяне не дапусьцілі, а яшчэ на двух мне паставілі дрэнныя адзнакі. 7 ліпеня дэкан факультэту, сказаў, што я буду адлічаны з універсітэту за непасьпяховасьць.

Адлічэньне Расьціслаў бачыць вынікам сваёй палітычнай актыўнасьці ў незарэгістраванай арганізацыі Малады Фронт.

Моладзеваму актывісту Арцёму Ластавецкаму паведамілі пра ягонае выключэньне з другога курсу Беларускага універсітэту інфарматыкі і радыёэлектронікі:

"Рэктар БДУІРа Батура М.П. толькі сказаў пра маё выключэньне, афіцыйнай пісьмовай пастановы яшчэ няма, – кажа маладафронтавец. – Фармальная прычына адлічэньня – акадэмічная непасьпяховасьць. Дзіўна, але, па словах рэктара, мяне выключаюць з-за таго, што на першым курсе ў мяне быццам бы ўзьнікалі праблемы з навучаньнем".

Арцём Ластавецкі па выніках летняй сесіі быў пераведзены на другі курс, пасьля чаго і даведаўся пра адлічэньне з першага. Ён упэўнены, што ціск з боку адміністрацыі універсітэту зьвязаны з палітычнай дзейнасьцю, у прыватнасьці, з апошнімі арыштамі маладафронтаўца.

Актывістка моладзевага дэмакратычнага руху Кацярына Манчук лічыць, што прычынамі яе выключэньня з Мазырскага дзяржаўнага універсітэту стала палітычная дзейнасьць. Раней дзяўчыну выклікалі на размовы ў дэканат і прасілі спыніць грамадзкую актыўнасьць. Адміністрацыя універсітэту катэгарычна настойвае, што дзяўчына пацярпела, бо кепска падрыхтавалася да сесіі.

Кацярына Манчук вучыцца на трэцім курсе тэхналагічнага факультэту ў Мазырскім дзяржаўным універсітэце. Яна расказала, што спачатку не магла здаць залікі, а потым сутыкнулася з цяжкасьцямі пры здачы экзаменаў летняй сесіі:

"Я лічу, што адміністрацыя універсітэту наўмысна хоча мяне адлічыць. Дзеля гэтага робіцца ўсё, каб я не здала сесію. Праблемы пачаліся яшчэ на пачатку году, калі мяне затрымалі ў Менску. Потым мяне пачалі дапытваць, выведваць, вадзіць да прарэктараў, да рэктара. У гэтую летнюю сесію я не магла здаць ні залікі, ні экзамены. Калі я прыехала з Літвы ад сваіх сяброў, даведалася, што на мяне ёсьць фармальнае адлічэньне. Калі я прыйшла да дэкана, то ён мне адказаў: "Не, не, не. Ты яшчэ вучышся, у цябе сесія".

Нагадаем, сёлета з беларускіх навучальных установаў з фармулёўкай "за акадэмічную непасьпяховасьць" адлічылі каля дзясятка актывістаў моладзевага дэмакратычнага руху, сярод якіх Кася Салаўёва, Франак Вячорка, Іван Шыла ды іншыя. З 2006 году ў замежных універсітэтах займаюцца больш за паўтысячы студэнтаў, адлічаных з беларускіх навучальных установаў.

# Наведаць арыштаваных актывістаў,
## каб пабачыць умовы ўтрыманьня зьняволеных...

Офіс АБСЕ у Менску займаецца праблемай умоваў побыту затрыманых у турме на Акрэсьціна. Пра гэта паведаміла ў лісьце арганізацыі “Маладыя дэмакраты” выконваючая абавязкі кіраўніка Офісу Марыя Лагус у адказе на іх просьбу наведаць арыштаваных актывістаў.

“Мы неаднойчы атрымлівалі інфармацыю пра ўмовы ўтрыманьня ў гэтым Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў, – адзначыла яна. – Да таго ж, прадстаўнікі Офісу асабіста наведвалі цэнтр на вуліцы Акрэсьціна. Інфармацыя па гэтай праблеме дасылаецца намі ў адпаведныя органы АБСЕ і краіны-ўдзельніцы АБСЕ”.

Марыя Лагус паведаміла таксама, што цяпер Офіс АБСЕ ў Менску робіць захады дзеля абмеркаваньня ўмоваў утрыманьня ў турме на Акрэсьціна з кампетэнтнымі органамі Рэспублікі Беларусь.

У звароце, скіраваным у Офіс АБСЕ 21 ліпеня, “Маладыя дэмакраты” выказалі занепакоенасьць масавымі арыштамі дэмакратычных актывістаў напярэдадні выбараў. Яны падкрэсьлілі, што ад дзеяньняў уладаў церпяць перадусім юнакі.

Так, 11 ліпеня былі затрыманыя трое актывістаў “Маладых дэмакратаў” – Кірыла Паўлоўскі, Віталь Стажараў і Міхась Пашкевіч. “Ім было вылучанае непраўдзівае абвінавачаньне ў нецэнзурнай лаянцы ў грамадзкім месцы, што пацягнула арышт па артыкуле 17.1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях”, – адзначаюць моладзевыя актывісты.

Цяпер у турме на Акрэсьціна знаходзяцца намесьнік старшыні моладзевага крыла АГП “Маладыя дэмакраты” Міхась Пашкевіч і старшыня Менскай гарадзкой арганізацыі “Маладыя дэмакраты” Віталь Стажараў.

Падобныя арышты, паказалі аўтары ліста, ужо чыніліся і раней. Да таго ж у арыштаванага Міхася Пашкевіча ёсьць судзімасьць за ўдзел у студзеньскім мітынгу прадпрымальнікаў (вядомы “працэс 14-ці”). Цяпер яму пагражае абмежаваньне волі на больш працяглы час.

“У сувязі з тым, што ўлады чыняць рэпрэсіі супраць палітычных апанентаў; зьневажаюць годнасьць, губяць здароўе і ламаюць жыцьці – просім Вас наведаць цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў па адрасе: Менск, зав. Акрэсьціна, 36, да 26 ліпеня 2008 году з тым, каб пабачыць умовы ўтрыманьня і падтрымаць актывістаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі”,

## Спроба масавага суіцыду ў бабруйскай калоніі

**21 ліпеня стала вядома, што шасьцёра вязьняў бабруйскай калоніі ўскрылі вены на знак пратэсту супраць цкаваньня з боку адміністрацыі папраўчай установы. Раней невядомыя асобы тэлефанавалі ў рэдакцыі незалежных СМІ і папярэджвалі, што вязьні учыняць суіцыд 18 ліпеня, паведамляе Хартыя-97.**

**Пазьней нейкі мужчына па тэлефоне паведаміў у рэдакцыю "КП в Беларуси", што вязьні перарэзалі сабе вены.**

**“Сапраўды, шасьцёра чалавек падрапаліся, – паведаміў першы намесьнік начальніка Дэпартаменту выкананьня пакараньняў Юры Барынкоў, – Гэта людзі 20-30 гадоў. Ім аказалі дапамогу медыкі. Іхнім жыцьцям нічога не пагражае. Гэта не адзінкавы выпадак. За апошнія суткі яшчэ некалькі чалавек парэзалі рукі. Гэта такая турэмная субкультура, як наколкі”.**

# «The Times»: "Зэльцэра катавалі ў турме КДБ"

30 ліпеня ў Менску пачаўся закрыты працэс па справе амэрыканскага адваката Эмануіла Зэльцэра. Як піша брытанская газета “The Times”, Зэльцэр – адна з галоўных дзейных асобаў сутычкі за маёмасьць алігарха Бадры Патакарцышвілі. Выданьне адзначае: са зьвестак “Amnesty International”, пад вартай Зэльцэра катавалі.

Зэльцэр быў арыштаваны пасьля таго, як прыляцеў у Беларусь. Яго абвінавацілі ў наяўнасьці пры сабе падробных дакументаў. Пры якіх акалічнасьцях Зэльцэр апынуўся ў Беларусі, дагэтуль загадка. Юрыст прыляцеў туды на прыватным самалёце, які належыць алігарху-выгнаньніку Барысу Беразоўскаму. Між тым Зэльцэр і Беразоўскі знаходзяцца па розныя бакі барыкады ў барацьбе за маёмасьць памерлага грузіна Аркадзя Патакарцышвілі, піша “The Times”.

Зэльцэра абвінавачваюць у выкарыстаньні падробных дакументаў і прамысловым шпіянажы. Яму таксама вылучанае абвінавачаньне ў транспарціроўцы наркотыкаў: рэч у тым, што ён прымае лекі ад артрыту і падагры – абязбольвальныя прэпараты, якія зьмяшчаюць кадэін і выдаюцца па рэцэпце. За гэта яму пагражае сем гадоў турэмнага зьняволеньня.

Злучаныя Штаты запатрабавалі з меркаваньняў гуманнасьці вызваліць Зэльцэра з-пад варты, сьцьвярджаючы, што знаходжаньне за кратамі можа нанесьці яго здароўю непапраўную шкоду ці нават выклікаць сьмерць...

# "Мы ўзялі на сябе адказнасьць за будучыню краіны"

(Пачатак на стар. 8)

– Уразіла, што за два гады пакараньня я не сустрэў аніводнага чалавека, які б падтрымліваў дзеючага кіраўніка дзяржавы. Яшчэ запомнілася перапоўненасьць нашых сьледчых ізалятараў (СІЗА), здаралася нават, што падсьледчыя спалі на падлозе. Цікава, навошта трымаць чалавека ў СІЗА, калі яго віна яшчэ не даказаная і калі для яго няма месца, прасьцей бы было выпусьціць чалавека пад падпіску аб нявыязьдзе, чым так катаваць.

**Тры правакацыйныя пытаньні**

*– Ці праўда, што Малады Фронт па ініцыятыве Зьмітра Дашкевіча (кіраўніка арганізацыі) неафіцыйна прыняў да дзейнасьці канцэпцыю папулярызацыі "рэлігійнай дыктатуры" замест прынцыпаў прыярытэту нацыянальнай дзяржавы, свабоды, дэмакратыі?*

– Гэта толькі чуткі і абсалютная няпраўда. У нас у арганізацыі мір і супакой, віруе толькі праца. Рэлігійнасьць у нашых шэрагах ніхто не навязвае і за руку ў царкву не вядзе.

*– Чаму месяц таму з Управы Маладога Фронту – кіруючага органу арганізацыі – сышлі даволі значныя актывісты: Хведарук, Сяргееў, Янушэўскі і некаторыя іншыя асобы?*

– Іх ніхто не выключаў, гэта іх рашэньне. Галоўнае, яны застаюцца ў структуры арганізацыі і працягваюць нешта рабіць. Калі некаторыя асобы ня здольныя спраўляцца з абавязкамі, навошта ім адказныя пасады?..

*– Большая частка апазіцыі рыхтуецца да ўдзелу ў выбарах. Вашая арганізацыя – адна з нешматлікіх, якія заявілі пра байкот выбараў. Чаму?*

– Таму што выбары можна назваць ужо зараз недэмакратычнымі, пра гэта могуць засьведчыць абсалютна ўсе ўдзельнікі грамадзкага жыцьця. Дзеючы рэжым у дадзенай сітуацыі ня толькі не ідзе на лібералізацыю і перамовы з прадстаўнікамі дэмакратычнага руху, а ўсё больш закручвае гайкі. Выбары самі па сабе мусяць быць дыялогам улады з грамадзтвам. Зараз ён немагчымы.

Сэнсу прымаць удзел у гэтых выбарах я ня бачу, апроч таго, па дадзеных НІСЭПД за сакавік 2008 году, 52 адсоткі апытаных лічаць, што выбары ў РБ фальсіфікуюцца. А трацiна выбаршчыкаў, як у любой дэмакратычнай краіне, увогуле ня ходзіць на галасаваньне. Калі мы здолеем правесьці ўдалую кампанію байкоту, то аб’яднаем гэтую трацiну і дэмакратычна настроены электарат.

# У рэлігійных краінах самагубстваў менш

## Беларусь выйшла ў сусьветныя лідэры па колькасьці самагубстваў

Узровень самагубстваў вялікі ва ўсіх краінах рэгіёну, але Беларусь за апошнія гады абагнала ўсіх і выйшла ў сусьветныя лідэры. Навукоўцы тлумачаць гэты змрочны ўзьлёт ростам спажываньня алкаголю, суб'ектыўным адчуваньнем адсутнасьці жыцьцёвых перспэктываў, дэпрэсіўным асяродзьдзем, нізкімі выдаткамі на культуру, а таксама тыпам культурнай традыцыі.

Сацыёлагі з Інстытуту Гэлапа ў сваёй публікацыі паказалі сувязь колькасьці самагубстваў з рэлігійнасьцю грамадзтва. Сусьветныя сацыялагічныя дасьледаваньні Інстытуту з 2005 да 2006 году выявілі, што рэлігійныя краіны маюць ніжэйшыя паказьнікі самагубстваў.

Рэспандэнты, якія бралі ўдзел у апытаньні, адказвалі на наступныя пытаньні: "Ці адыгрывае рэлігія важную ролю ў Вашым жыцьці?", "Ці хадзілі Вы ў царкву за апошні тыдзень?", "Ці давяраеце Вы рэлігійным арганізацыям у сваёй краіне?". Станоўчыя адказы на гэтыя пытаньні давалі паказчык агульнага ўзроўню рэлігійнасьці ў краіне.

Параўнаньне паказчыку рэлігійнасьці ў розных краінах з статыстыкай самагубстваў за 2007 год вырысоўвае яскравую тэндэнцыю: у больш рэлігійных краінах самагубстваў менш. Напрыклад: Філіпіны маюць найвышэйшы паказьнік рэлігійнасьці ў сьвеце (79), у Японіі ён адзін з найніжэйшых у сьвеце (29). А самагубствы? На Філіпінах яны здараюцца ў 12 разоў радзей, чым у Японіі!

Парагвай, дзе паказчык рэлігійнасьці нашмат вышэйшы за суседні Уругвай, мае і статыстыку самагубстваў у 4,5 разы ніжэйшую за ўругвайскую.

Месца ЗША ў сьпісе "рэлігійнасьці" краінаў знаходзіцца недзе ў сярэдзіне (61). Гэткае ж сама месца ў гэтай краіны і паводле статыстыкі самагубстваў, 32-е — з 67 краінаў.

Інстытут Гэлапа ўключыў у сваё дасьледаваньне толькі 67 краінаў, бо апошнія зьвесткі пра самагубствы ў многіх краінах былі недаступныя.

Агульныя высновы сацыёлагаў пацьвярджаюцца таксама на прыкладзе асобных рэгіёнаў, у тым ліку краінаў былога СССР. Да прыкладу, у 12 постсавецкіх краінах назіраецца выразная карэляцыя самагубстваў і рэлігійнасьці. У гэтым плане самыя выразныя краіны — Арменія, Грузія і Таджыкістан, дзе паказьнік рэлігійнасьці высокі, асабліва калі параўнаць яго з паказьнікам у астатніх постсавецкіх краінах. Статыстыка самагубстваў стабільна нізкая ў трох пералічаных краінах.

У той жа час паказьнік самагубстваў мала зьвязаны з заможнасьцю людзей. У цэлым, больш заможныя краіны менш рэлігійныя. Рэлігійнасьць зьмяншаецца па меры росту дабрабыту. Дык вось, дасьледаваньне паказвае, што статыстыка самагубстваў трохі вышэйшая ў больш заможных краінах. Аднак адносіны паміж узроўнем ВУП і самагубствамі не такія моцныя, як з рэлігійнасьцю.

Сацыёлагі з Інстытуту Гэлапа адзначаюць, што бедныя краіны з больш высокім паказьнікам рэлігійнасьці маюць не заўсёды поўную статыстыку самагубстваў — праз нерэгулярнасьць медыцынскай справаздачнасьці ці праз грамадзкае клеймаваньне гэтай зьявы. Аднак калі параўноўваць паказчыкі толькі заможных краінаў, у якіх справаздачнасьць дакладная, адназначна выяўляецца трывалая ўзаемасувязь паміж рэлігійнасьцю і ўзроўнем самагубстваў.

Вядома, адной рэлігійнасьцю справа не тлумачыцца. Так, узровень самагубстваў у Беларусі вышэйшы, чым у менш рэлігійных і больш заможных суседніх Эстоніі, Латвіі, Чэхіі ці нават Расеі. Хоць мусіла б быць наадварот. Тут першасную ролю адыгрывае, відаць, суб'ектыўнае адчуваньне жыцьцёвае бесьперспектыўнасьці, сама сутнасьць сістэмы кантролю над чалавекам, збудаванай у краіне, у спалучэньні з культурнай спадчынай.

Вынікі атрыманыя на падставе апытаньня, зробленага сам-насам ці па тэлефоне, якое ладзілася ў 2006 г. і ў якім бралі ўдзел каля 1000 дарослых людзей з кожнай краіны. Для ўсіх краінаў у сьпісе статыстычная памылка сярэдняга паказьніку рэлігійнасьці можа складаць 3%. У дадатак да памылкі выбаркі, пастаноўка пытаньня і практычныя складанасьці ў правядзеньні апытаньня могуць вылівацца ў памылкі ці адхіленьні ў выніках апытаньня.

***Паводле gallup.com***

# "Маскі-шоў" ад амапаўцаў

## Затрыманыя падчас летніку пад Барысавам зьбіраюцца падаваць скаргі ў пракуратуру

26 ліпеня міліцыя затрымала больш за 60 маладых людзей ва ўзросьце ад 15 да 25 гадоў, якія зьбіраліся правесьці гульню "Моладзевая рэспубліка". Лагер быў разагнаны АМАПам, усіх яго ўдзельнікаў пасадзілі ў аўтобусы ды адвезьлі на допыт у Барысаўскае раённае ўпраўленьне ўнутраных справаў. Тры чалавекі былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці – нібыта за парушэньне нормаў пажарнай бясьпекі. Па версіі міліцыі, прычынай разгону моладзевага лагеру з дапамогай АМАПу былі распаленыя ў лесе вогнішчы.

Пры затрыманьні маладых людзей амапаўцы груба лаяліся ды ўжывалі сілу, непаўнагадовых удзельнікаў лагеру міліцыянты дапытвалі без бацькоў, што забаронена законам. У затрыманых узялі адбіткі пальцаў. Пра гэта расказвае адна з удзельніц летніку Лізавета:

– Я бачыла, як амапаўцы білі людзей пры затрыманьні на паляне. Пасьля таго, як мы прыехалі ў Барысаўскі РУУС, малодшых вывелі на допыт першымі. Іх дапытвалі без бацькоў. Мяне міліцыянты пыталі пра тое, хто зьяўляецца арганізатарам летніку, ці ведаю я людзей, якія ў ім удзельнічалі. Пасьля гэтага я падпісала пратакол аб адміністрацыйным затрыманьні.

Людзі, якія былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці – аштрафаваныя – адрозьніваліся ад іншых затрыманых толькі тым, што задавалі шмат пытаньняў міліцыянтам ды спрабавалі з імі спрачацца.

Удзельнікі лагеру ды іх бацькі зьбіраюцца падаць калектыўную скаргу ў пракуратуру, якая датычыцца беспадстаўнага прыцягненьня да адказнасьці 3 чалавек, запалохваньня ды ўжыцьця сілы з боку АМАПу, а таксама допыту непаўнагадовых, праведзенага з парушэньнем закону.

Пра гэта паведаміў сябра Беларускага Хельсінскага камітэту Анатоль Гулак:

– Летнік разганялі як нейкі экстрэмісцкі лагер – з удзелам АМАПу, а вынікам усяго гэтага "маскі-шоў" стала прыцягненьне да адказнасьці 3 чалавек за парушэньне правілаў пажарнай бясьпекі. Калі б гэта было сапраўдны прычынай затрыманьня, уся працэдура выглядала б інач. Канешне, калі затрыманьне і допыт праводзяцца такімі метадамі – гэта можна адназначна кваліфікаваць як запалохваньне. Мы будзем падаваць скаргі на незаконныя дзеяньні міліцыі і беспадстаўнае прыцягненьне да адказнасьці 3 асобаў. З падачай скаргі мы пакуль не сьпяшаемся, бо хочам падрыхтаваць якасны дакумент.

Па словах удзельнікаў лагеру, пад скаргамі могуць паставіць свае подпісы некалькі дзясяткаў чалавек.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.